Бг 9993

КУЗЬМА ЧОРНЫ

# ВЫБРАНЫЯ
# Апавяданні

Wx11388

Бг 9993

КУЗЬМА ЧОРНЫ

# ВЫБРАНЫЯ АПАВЯДАНЬНІ

Инв. 1953 г. Бн 9993.
Бел. аддзел
1994 г.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
ЛіМ
МЕНСК 1932

Б 4-75

такоў
Рэдактар П. К. Пуроўскі
Тэх. рэд. М. Кавалёва
Ко...
...дана ў друкарню 28-II-32 г.
Падпісана да друку 3/IV—32 г.

Вокладка мастака *Заворава*

25. 04. 2009

Заказ № 561 3000 экз. (3 арк.) Галоўлітбел № 19...

Друкарня імя Сталіна.

## ...сям'я Юрыя Гарэйкі

Вайна адышла наперад: цяпер ужо фронт ні ...гадзіны ня трымаўся на адным месцы, палякі ...адыходзілі шпарка і лесавая дарога вось ужо ...тры дні жыла нашым паходам. Мы прайшлі Наваградчыну за хмурныя дні, а на Гародзеншчыне мы адчулі сухую сьпеку ліпеньскага сонца.

Цэлую ноч мясілі мы сухі пясок, жорсткі, ...калючы, па дарозе гэтай губілі мы свае сілы і чулі, як выростае ў нас неперdroжная патрэба кінуцца на зямлю і тут-жа забыцца на ўсё. Але мы йшлі, думаючы калі скончыцца пясок. Цьвёрдая зямля ўжо здавалася нам за той самы салодкі сон на зямлі. З самага вечару мы мінулі мястэчка Ражанае ці Ражаны—наш зводны, таварыш Скабакоў глядзеў на карту, але не знайшоў яго і сказаў назву гэтак, як сам пачуў—нявыразна. За поўнач пясок пачаў мінацца, а напярэдадні зачарнелі лясы і над

імі месяц. Мы-б адчулі гэтае хараство ночы (ціхае хараство ў вайну!), але дрымота і здрантвеласьць цела туманіла нам галовы і зацягвала сэрца карою абыякавасьці. Чацьвертую пору мы ня спалі.

Мы дайшлі да лесу, яшчэ не пачынала сьвітаць і тут нам быў загад спыніцца. Мы маглі цяпер перадыхнуць; вартавых зьменьвалі часта і прычакалі гэтак дня. Досьвіткам дазналіся, што будзем чакаць тут наступнае ночы, тады рушым далей, а цяпер—мы ўсе ўпокат ляжалі за паўзьлеснымі хмызьнякамі, на мяжы лесу і поля. Гэтак застаў нас сонечны дзень.

Ён зіхацеў над зямлёю гэты сонечны дзень. Мы-ж яго ня чулі і ня бачылі. Варушыцца пачалі мы тады, як сонца стаяла коса над лесам, сьвятло яго ружовілася ўжо; лес і поле маўчалі.

Мы адыходзілі ў тыл і чакалі пакуль прамаршыруюць паўз нас, дагэтуль тылавыя каманды. І яны маршыравалі, сьпешна, ня спыняючыся надоўга і шкадуючы пакідаць за сабою гэткі прывабны і прытульны куток.

Поле была перад лесам шырокае—спрэс усё адзін палетак, а далей, за жытам і бульбаю—чырвоніўся дах палацу, абрысы-ж усяго маёнтку,

можна сказаць, зусім хаваліся ў вясёлым зялені́ве таполяў і клёнаў. Мы тут-жа высыпалі на поле шукаць бульбу. Нас ня лішне было шмат— у Наваградчыне мы мелі гаручую сутычку і пасьля гэтага ў нашай роце засталося чалавек сорак. Пасьля гэтага мы слаўна выканалі марш свой аж дагэтуль і толькі адзін з нас, Юры Гарэйка зусім выбіўся з сіл, зваліўся з ног і мы разьвіталіся з ім у паходным шпіталі: ён падняў руку ўгару і памахаў ёю, пасьля палажыў яе ўздоўж тулава і адразу задрымаў. Вядома, ня ўсе мы выкопвалі штыкамі і цесакамі бульбу, з палова нашых яшчэ адлежвалася на гэткай мяккай і жаданай зямлі.

Поплеч са мною йшоў цяпер сагнуўшыся і арудуючы цесаком, мой паходны друг і таварыш, Скабакоў, высокі, здаровы і адважны хлапец. Мы адпачылі і ня кепска (праспаць маглі-б яшчэ ночай дзьве засаб, але на вайне зусім сваё, асаблівае, адмысловае разуменьне адпачынку, спакою, трывогі, гадзіны ночы...)— дык мы чулі сябе цяпер добра. Скабакоў спрытна біў цесаком у зямлю, вывaрочваў бульбяныя карчы, а бульба тая была яшчэ дробная, вадзяная—сьпела яна толькі ўвосень.

У ім бушаваў уздым і ахвота да слова. Апошнюю ноч і дзён ён быў ужо нязвыкла маўклівы—утома прымусіла яго маўчаць і гэтак, сьцісну ўшы зубы, мясіць жвірыстую дарогу.

На Наваградчыне, пасьля таго, як нас засталося чалавек сорак, ён сабраў нас перад нашым рухам наперад:

— Ну, цяпер пойдзем, малайцы. Дарогу прачысьцілі, работа была гарачая, але добра, што сонца не пякло, усё менш поту вылілі.

Жартаваць ён ня ўмеў, ня быў да гэтага здатны. Але мы ведалі яго натуру і былі ўдзячны яму за гэтыя „жарты". Гэткімі няспрытнымі „жартамі" ён бадзёрыў нас, гэтак мы чулі ад яго жаданае нам слова. Проста сказаць—мы яго любілі. Некаторыя з нас былі босыя—спрэс растаптаныя чаравікі зусім паўлазілі з ног і ён, вось ужо больш за тыдзень, цешыў нас кожны дзень:

— Мы самі вінаваты. Даўно пара нам адбіць дзе небудзь хвост польскага транспорту.

Перад гарачаю Наваградзкаю справаю мы паабедалі былі гэткім чынам: у дрэнным паўпанскім маёнтачку знайшлі былі ў гумне паўскірты жытніх снапоў. Зараз-жа паабівалі

зэрне аб ток і сьцены і варылі кашу. Елі і хвалілі, але ці льга раўняць той абед з цяперашняю бульбаю?

— Мы й забылі.

— Што мы забылі?

— А ну ўспомні. Ну ўспамінай. Паглядзі навокал і ўспамінай... Эх ты, дзівак. Галаву й сэрца ня згубіў яшчэ? Ну от глядзі цераз поле, упоперак на гасьцінец. З самае Наваградчыны мы прышлі сюды гасьцінцам. Так? Ну, а пасьля пяскоў за мястэчкам увайшлі куды? У лес! Гасьцінец увайшоў у лес, усёроўна як ён рассунуў гэты лес папалам. Памятаеш, як ён казаў: „гасьцінец рассоўвае лес папалам“. Перад лесам, збоку крыху ад гасьцінцу маёнтачак у таполях і клянох;

— Успомніў. Ну й тaварышы-ж мы!

Але Скабакоў гаварыў да канца:

— ... Цяпер яшчэ скрозь паўз лес, між ельнікам і хмызьняком дарога пойдзе ўлева, калі стаць тварам да лесу, дарога—як з калесьмі праехаць. Ну?

— Ну, я ўспомніў,—з прыкрасьцю нейкаю да самога сябе сказаў я.

— Я чуў, што Скабакоў упікае і мяне й сябе.

— Прайсьці крокаў з тысячу ад гасьцінцу і ў ельніку будзе хата.

Гэта я ўжо запабягаў наперад перад Скабаковым.

— Шпіталь едзе паволі. Ён можа праз некалькі дзён ўсяго будзе тут, калі куды ў бок ня зьверне,—задумённа сказаў Скабакоў.

— Добра. Да захаду сонца яшчэ добры кавалак часу. Усьпеем да ночы. Ліст захаваўся?

— Згубіў!—панура пазьдзекваўся з мяне Скабакоў.

Пасьля абеду мы пайшлі туды. Нам трэба было спраўляцца шпарка—мы спадзяваліся, што пад поўнач будзе нам загад рушыць далей. Дазвол нам быў дадзен на гадзіну ўсяго.

За дзень вайна адышлася далёка наперад. Перафармаваньне нас у новыя часьці павінна было адбыцца праз дзён тры, пункт быў назначаны кілёмэтраў за сто адгэтуль. Пра гэта мы дазналіся пасьля полудня. Тут ужо спакайнела усё, быў ужо тыл. Мы бачылі, як у спаленай вёсцы сяляне, са звыклаю павольнасьцю сваёю, выбіралі на попелішчах асмаленае бярвеньне, як ужо браліся дажынаць перасьпелае жыта.

Мы прайшлі паўз ельнік ня тысячу крокаў, як думалі, а мо ўсяго пяцьсот. Адразу-ж зірнула на нас з узьлеску, за хмызьняком, прысадзістая хата, старая, з старасьвецкага смольнага бярвеньня.

— Ці ня тут?—сказаў Скабакоў.

— Можна запытаць.

Скабакову давялося нагнуцца, каб глянуць у вакенца. Спачатку ён нічога там ня ўбачыў. Ён пастукаў у шыбу. Ніхто не адазваўся. Мы ўвайшлі ў двор—звыклы сабе сялянскі двор, з хлявушкамі, павецьцю, весьніцамі на прыгуменьне. Ля парогу ў сенцы ляжаў камень— палова вялікага млынавога каменя. Дзьверы ў сенцы былі адчынены. Там сядзеў стары чалавек і спакойна глядзеў на нас. Ля яго стаяла конаўка з квасам, корч зялёнае цыбулі і тоўстая луста хлеба. Мы спачатку й не заўважылі, што ён вельмі стары—відаць ён галіўся, або нізка выстрыгаў бараду і вусы—была на твары толькі нізкая сівая шчэць. Твар быў шырокі, але паморшчаны і худы. Ён агледзеў нас спакойна і холадна сказаў:

— Нічога няма. Ідзеце, таварыш, далей. А калі вам паначаваць, дык таксама няма як— у хаце ў нас хворая ляжыць, а ў пуні нідзе

саломы й каліва няма. Хіба у садку, але-ж лепш ужо ў лесе.

— А нам нічога й ня трэба,—сказаў я.

— Гэта Гарэйкава хата ці не?—запытаў Скабакоў.

Тут чалавек ажывіўся крыху. Ён высока ўзьняў твар, цяпер мы заўважылі, што ён вельмі стары. Вочы яго былі чырвоныя, за жыцьцё, відаць, папсаваныя, лоб высокі, прыгожы, і нізкі сівы чубок тырчаў над ім.

— Што-ж вы за людзі, служывыя, што нашу хату ведаеце? Адкуль вы?

Далёкія,—пачаў гаварыць Скабакоў, я алонецкі.

— Ня чуў ніколі,—затрос галавою стары.

— Далёка гэта, на поўнач, усю Расію трэба прайсьці.

— О-ё-ёй!

— Дык от,—гаварыў Скабакоў,—мы разам служым з Юрыям. Ен змарыўся і на некалькі дзён лёг у паходны шпіталь. Ён адстаў ад нас і напісаў вам ліст. От ён.

— Юры,—гэта мой сын.

Стары сказаў гэтак спакойна, што нам дзіўна гэта здалося. Юры гады два як разлучыўся з сваімі, мы гэта ведалі. Нават расчараваньне

агарнула нас. Мы падумалі—аддалі ліст і пойдзем.

Стары трымаў ліст ў руках. Ен стаяў і мы бачылі, што гэты стары—высокі, сухі, калісьці мусіць быў вельмі моцны. Маўчанка цягнулася з хвіліну. І тут у хаце пачуўся жаночы голас:

— Тата, тата.

Стары адчыніў дзьверы ў хату і мы адчулі адтуль душны зирок. Пасьля разглядзелі, што на пасьцелі ляжыць укрытая кужэльнаю коўдраю жанчына. Стары, здавалася, забыўся на нас у гэты момант. Ён падаў жанчыне ў медзянай конаўцы квасу, яна памачыла губы і піць не захацела. Стары штосьці зашаптаў ёй, ківаючы ў наш бок галавою. Мы прыселі ў сенцах на лаве. Стары неўзабаве вярнуўся, але мы бачылі, як у хаце пачаўся неспакой: жанчына дзіўна заварушылася, падушка з-пад яе галавы зьехала на самы край ложка, коўдра сьцягнулася на ногі, яна зноў паклікала бацьку. Бацька цяпер даў ёй у рукі ліст, яна паднесла яго да воч і пачала прыглядацца. Пасьля з вінаватаю ўсьмешкаю працягнула назад старому. Той кіўнуў у хату нас.

— Ну дык прачытайце хто небудзь,—сказаў ён,—я ня ўмею.

Скабакоў узяўся чытаць ліст. Юры апісваў свае два гады. Мы самі з цікавасьцю даведваліся яго гэтую гісторыю.

Таму назад з год мы сышліся разам у сваей роце. Ён быў добры дружака, але пра сябе гаварыў неахвотна, ня любіў лішне займацца сабою, ня любіў расказваць. Мы дружылі з ім вельмі, але ўсяго й ведалі пра яго, што ён з тэрыторыі, занятай палякамі, што ўцёк адтуль, але як і што—не гаварыў ніколі. І вось цяпер мы разам з яго роднымі, даведваліся гэтую гісторыю.

Ён пачынаў апісваць з таго, як сядзеў ужо ў польскім астрозе. Да гэтага, вядома, у хаце ведалі ўсё.

Была ноч, як у астрозе ён даведаўся, што яго будуць страляць. Перад гэтым яго білі, разьдзелі і ўвапхнулі ў астрожную камэру. Толькі ў адных споднiках, нават без сарочкі. Быў на дварэ вецер, раньняя зіма, зямля была яшчэ голая, але замерзлая і сыпаўся зьверху сьнег-крупа. Зьмерклася, было рана, ноч цягнулася доўга, з другога паверху, дзе была камера, праз вакно відаць было поле за астрожнаю агароджаю. Цэмантовая падлога у камеры намерзла, босыя ногі пачалі карчанець і ён скінуў спод-

нікі і падслаў пад ногі. Цяпер ён чуў, што накуль застрэляць, дык з холаду зойдзецца. Раптам ён заўважыў, што краты ў вакне як-бы пагнутыя крыху, мусіць хтосьці спробаваў ужо свайго шчасьця. З роспачы скочыў ён на вакно і скалынуў крату. З правага боку яна ледзьве упіралася у мур, два гвазды былі выцягнуты. Ён павіс усім целам на ёй і ўпёрся нагамі ў мур. Колькі разоў гэткае патугі і крата сагнулася. Ён раскалываў яе яшчэ і ўжо льга было пасадзіць у дзірку галаву й плечы. Ён хапіў свае споднікі, калоцячыся ледзьве ўзьдзеў іх і палез у дзірку. Пад вакном была вартаўнічая будка з бляшаным дахам, а адтуль крокаў чатыры да агароджы, на ёй таксама бляшаны дах. Іншага нічога ня было ўжо выбіраць і ён скочыў на вартаўнічую будку, а адтуль на агароджу. З агароджы ўжо скаціўся на мерзлае поле, скрываўлены аб краты і бляху. Яму самому потым дзіўна было, як гэта шпарка ўсё адбылося. Як адбегся ўжо крокаў дзьвесьце ад астрожнае агароджы, пачуў, як там пачалася трывога, выстралілі, закрычалі. Ён пабег шпарчэй, задыхаючыся. Сухі сьнег сек яго голае цела і гэтак ён даскочыў да ляска. Там ужо зусім аслабеў. Забівала дух, халодны пот зма-

чыў яго ўсяго. На ўзьлеску ён перадыхну
самы найкарацейшы момант і пабег далей, а
ня ў лес, а паўз яго, дзе як праз туман воч
ўбачылі будынак. Тады ўжо сьнег пакінуў сь
пацца, бялявае месячнае сьвятло лягло н
зямлю.

У хаце гарэў агеньчык. Ён застукаў у шыбу

— Жаўнеры не стаяць тут?

— Не,—адказаў з хаты мужчынскі голас,—

— А што?

Тады ён убег у хату. І адразу прызнаўся:

— Я ўцёк з астрогу. З-пад расстрэлу. Бачыц
які я.

— Лезь на печ—адказаў чалавек.

На печы ён адчуў, як забалела моцна раптам
у нагах.

— Гэта па табе стралялі? Чуваць было,—
пытаўся мужчына.

— Па мне.

— Здарава-ж ты бег, за хвілін якіх пяць
даскочыў сюды... Ты-ж доўга не сядзі тут, а вы-
біраўся. І табе самому, і мне... На выпі малака
і йдзі... Пашукай яму чаго апрануцца (гэта да
жонкі).

Баба прынесла з гары старую кажушаную,
усю аблезлую, шапку, каравыя старыя нагавіцы,

кажушок бяв воўны і каўняра і лапці. Начапіла ячшчэ на яго торбу і палажыла туды акраец хлеба. Цяпер гэта быў сапраўдны старац. Гэтак ён і рушыў у дарогу. Ішоў ён да фронту начамі, туляўся па лясох, здолеў перабрацца цераз фронт і от...

Жанчына нэрвавалася. Пакуль Скабакоў дачытаў ліст, твар яе быў мокры ад сьлёз і нам толькі дзіўна было, чаму стары як дзеравяны ўсё—адно. Холадам веяла ад яго твару.

А дзе цяпер той шпіталь?—запытала жанчына.

Голас яе дрыжаў ад хворасьці, быў слабы і хрыпаваты.

— Дзе шпіталь—мы цяпер ня ведаем. Ён можа нават тут праехаць, а можа ўбок куды падацца, як патрэба будзе.

Першая вестка ад яго з самага таго часу,— сказала жанчына.

Нас дзівіла вельмі халоднасьць старога. Здавалася, што ён думае пра штосьці сваё, перад чым уся гэтая важная яму навіна пра сына—нішто.

Мы пачакалі крыху, нам здавалася, што мы павінны пра штосьці тут даведацца, пачуць,

высьветліць. А пасьля нехацця паспрабавалі развітацца, але жанчына тады спыніла нас:

— А вы яго будзеце бачыць?

— Цяжка сказаць. Калі паправіцца хутка— дагоніць нас, а калі не—можам і ня ўбачыцца.

— Няўжо-ж ён дадому ня гляне?

— Як выйдзе. Калі тут прайходзіцьме...

— А так? Няўжо ня мог-бы, каб хацеў, збочыць з дарогі, хоць на дзень сюды?

У голасе яе была хворая раздражненасьць, але тут-жа яна прымусіла сябе зрабіцца інакшаю. Як-бы адчуваньне вінаватасьці засьвяцілася ў ваччу яе. Стары гэта заўважыў. І мы тут аж сумеліся, як убачылі гэта: халодны гэты стары гэтак чула ўспрыймаў кожны рух пачуцьця і думкі маладое жанчыны.

Стары патупаў ля парогу, пазіраючы на нас, пасьля пакашляў у сенцах. Мы не здагадаліся выйсьці. Дык ён паклікаў нас.

— От што, вы яго таварышы,—загаварыў ён, садзючыся ў сенцах на сваё ранейшае месца,—вы яго трэба каб убачылі. Скажэце яму, што я ўсяго гэтага так не пакіну... Дык от... Пасьля таго, як яго тут злавілі і як ён уцёк быў цераз фронт туды, яе забралі і яна сядзела доўга. Іх ганялі ўсіх, што сядзелі,

убіраць ельнікам дарогу, па якой варочаўся назад пан, выгнаны паўстанцамі (і наш Юры там быў) з маёнтку. Пан, як варочаўся, дык яго ахоўвалі салдаты. Ехалі на конях, а мужыкоў усіх выгналі ісьці спатыкаць. Нас гналі цераз поле сьнегам нацянькі і загадалі яшчэ здалёк зьняць шапкі. Пан праехаў у фаятоне, а мы ззаду ішлі бяз шапак. І я ішоў бяз шапкі. Ня далі мне нават і апрануцца цяплей, я, стары, увесь адубеў. Тымчасам у двары нас выбралі некалькі чалавек—выбіралі з кожных дзесяцёх аднаго. Якраз папаўся й я. Нас пагналі ў скарбовае гумно, а там адсьцябалі лазою. Пан сам то ня прышоў глядзець на гэтую сваю пацеху, а прыслаў аконома свайго. Той глядзіць ды адно прыгаворвае: „Лес панскі секлі, а лазы й не здагадаліся спляжыць. Усё-адно як наўмысьля, каб было чым вас сьцёбаць“... Але ня з гэтага ўсё. От яна,—паказаў у хату на жанчыну,—прышла дадому з астрогу зусім хворая. Там яна ў холадзе й голадзе ўсе сілы пакінула. Абы за работу цяпер возьмецца, зараз і... Унь-жа пазаўчора гэта на полі цэлы дзень рабіла, а сёньня ўжо ляжаць ёй цалюткі дзень трэба. Я дзьве ночы і два дні вартаваў ля дарогі ў хмызьняку на тым тыдні, як пан



14 НВ. 1953 г. Эп-9933

выяжджаў зусім адгэтуль. Я не пашкадаваў бы сябе, зьвёў-бы яго з сьвету, а сам тады хоць памёр-бы спакойна. Але ён выехаў гэтак, што й доступу да яго ня было—за ім з дваццаць вайсковых коньнікаў. Ну як я даступіўся-б! Так яму ўсё і раскажэце, няхай тады што хоча думае. Рана вы прышлі сюды, каб яшчэ яны тут крыху пабылі, можа я што яшчэ й прыдумаў-бы... Я яшчэ яго спасьцігну дзе! Як вы думаеце, яны яшчэ сюды вернуцца ці не?

— Хто?—мы адразу нават разабраць ня здолелі.

— Паны.

Мы бачылі: у старога пануе адна думка. Ён дыхае помстаю.

— Хто-ж у вас больш у хаце ёсьць?

— Хлапчуку дванаццаты год, каровы пасе,— абазвалася ўжо гэта жанчына з хаты,—а дзяўчына, сястра Юрасёва, жыта жне сёньня. Пазаўчора мы з ёю ўдзьвёх жалі.

Мы бачылі—яна была рада цяпер пагаварыць з людзьмі. Мы стаялі ля парогу, стары варушыўся штосьці ў сенцах і неўзабаве сьціх. Мы бачылі ў ім адно—вялікі цяжар крыўды, панаваньне над усім ідэі помсты і бунту ў гэтай нерапоўненай бядотамі істоце.

Мы, праз якіх мо' хвілін пятнаццаць, пайшлі адгэтуль, больш як добрыя знаёмыя, блізкія людзям у гэтай хаце, а пад дзень пакінулі зусім гэтую мясцовасьць, каб больш не праходзіць ужо тут. Уночы мы прайшлі паўз самую хату (абходзілі лес берагам, дзе, за ім, загінаўся ўлева гасьцінец). Усё было ціха ў двара, хату ледзь заўважылі пад высокімі пнямі чорнага лесу. Тут, на хвойных карнявішчах, пахла адсырэлым за ноч жвірам, нага часам пападала ў жвірыстую каляіну.

Ці не пясок зноў будзе?—хтосьці сказаў з прыкрасьцю.

Але пяску больш ня было. Мы некалькі дзён ішлі цьвёрдым гасьцінцам, пераходы былі цяпер меншыя, адпачынкі—большыя. Мы дайшлі да месца фармаваньня новых часьцей так, на дзень пяты. Пункт гэты быў у баку ад гасьцінца кілёмэтраў за сорак, там ужо йшла чыгунка. Вагзал быў спалены, пажарышча было яшчэ сьвежае, усё ў белым попеле, сама-ж чыгунка ня была папсавана, тут чакалі цяпер першага цягніка. Гэта быў эшалён, такіх самых як мы, чырвонаармейцаў. Мы пазайздросьцілі ім: на зборны пункт яны ня йшлі пеша. Тут нас і дагнаў Юры.

Цяпер, калі ўсё ўжо гэта адышло ў час і толькі ўспаміны хвалююць сэрца, больш як тады адчуваю я тую зьмену, што раптам у тую хвіліну адбылася ў Юрыя. Як пачуў ён, што мы ліст аддалі, што самі нават яго чыталі, што былі ў яго хаце, ён страціў адразу сваю панураватасьць, страціў яе надоўга, аж да таго самага выдатнага моманту, што вызначыўся праз некалькі дзён, у хмурны здаровы адвячорак, за межамі ўжо Гародзеншчыны. Мы пазналі які, сапраўды, Юры жыцьцярадасны чалавек і як мы не разумелі дагэтуль яго, думаючы пра яго, як пра „панураватага". Нейкая інтымнасьць цяпер між намі зусім раскрыла яго нам. Мы ўжо зусім зьблізіліся.

— Дык вы бачылі і старога, і жонку, і сына?—гаварыў ён, увесь загарэўшыся.—Ну, а як бацька? Ох, зазнаў ён гора за век свой. За парабка быў, аратага, у двары цэлы век свой і нас там павыгадоўваў. Гэта я ўжо з парабкоўства вылез як-бы... Ну, а як спаткалі вас?

Скабакоў нехаця расказаў пра наша спатканьне з яго роднымі. І от тут выявілася яго падабенства з бацькам, этак, як і стары, ён неяк холадна спаткаў навіну пра хворасьць

жонкі, пра астрог, пра панскі двор. Можа гэта з таго, што прывык ён да цяжкіх падзей і навін?

Ажыўленьне яго мінулася, але маўклівасьць не варочалася. Мы ўтраіх трымаліся разам усе дні да таго адвячорка.

Фронт трэці дзень стаяў на адным месцы. Мясцовасьць была скрозь узгоркаватая, з рэдзенькім хмызьнячком у лагчынах — там, дзе мы, перафармаваныя часьці, стаялі. Гэта было яшчэ крыху ў тыл, але мы выходзілі на той бок хмызьняку,—дзе трымаўся фронт. Пасьля Наваградчынскае сутычкі мы ня бачылі ўжо больш засьцілаў бою. На вайне дзень — часта — эпоха, мы прывыклі да спакойных пераходаў і цяпер зноў разварушваліся. Памятаю, як Юры ляжаў поплеч са мною на пескавым беразе дробнае рэчкі. Бераг быў пляскаты, вада за намі была плыткая: хмурны цёплы вецер нават ня мог раскалыхаць яе, яна дробна дрыжэла, а ўсё-ж і ад яе йшоў водыр! Ён здаваўся нам вельмі моцны, вельмі востры — жыцьцё адчувалі мы цяпер з падвоенаю сілай.

Мы ляжалі доўга, цэлы ланцуг шэрых людзей. З паўдня, аж да змроку.

— Няўжо яна не паправіцца?—ціха сказаў мне Юры.

— Хто?

— Жонка. Як ты... ты-ж бачыў яе, гаварыў з ёю...

Што я мог сказаць, сам нічога ня ведаючы.

— Бацька дзівак,—гаварыў Юры,—ён думае, як адпомсьціцца аднаму пану, дык і ўсё на сьвеце выратуе. Няхай-бы лепш паменш думаў пра гэта, а...

Ён ня скончыў, ня могучы, мусіць, упікнуць бацьку.

— Ён чалавек мяккі, мой бацька. Крыўды заўсёды пераступаў... Як ты думаеш, будзем мы йсьці сёньня наперад, ці чакаць?

Узгоркі засланіся змрокам і мы адчулі як прабегла па ўсіх нас адно адчуваньне чагосьці блізкага. Мы пачулі, далёка дзесьці, вельмі загаварылі кулямёты і неўзабаве перад намі абазваліся вінтоўкі. Зараз мы будзем выбірацца на той бок рэчачкі.

Перад намі йшла ўжо гарачая работа, як мы рушылі туды з рэзэрву. За намі яшчэ беглі, ад гэтага моманту залежала ўдача. Як і заўсёды ў гэткія хвіліны, мы бачылі толькі тое, што

было блізка ля нас—зямлю пад нагамі, хмызь-
нячкі, узгорачкі перад намі... На небе запаль-
валіся зоры, але нам было не да іх, мы іх ня
бачылі. Неўзабаве нам давялося заняць першую
лінію і там мы пачалі недалічвацца аднаго за
адным сваіх таварышоў. Мы беглі ўсё наперад,
аж пакуль не пачулі каманды лажыцца. Лежачы
мы стралялі. Быў самы гарачы момант. Налева
быў адзін куток, дзе больш, як усюды, сыпа-
ліся варожыя кулі. Там быў наш кулямёт і рап-
там мы пачалі заўважаць, што ён змоўк. Юры
кінуўся туды, там было пуста—ляжалі пара-
неныя і няжывы кулямётчык. Юры нарыхта-
ваўся ў момант, кулямёт адсунуў наперад, ня-
жывы кулямётчык астаўся за ім. Праз колькі
доўгіх хвілін кулямёт зноў загаварыў. Тут мы
зноў пабеглі, пасьля пайшлі і йшлі ўжо ўсю
ноч, займаючы шырока мясцовасьць. Але Юры
астаўся. У той момант, калі мы рушылі, калі
ўсё ўжо было зроблена, адна з апошніх куль
урэзалася яму ў руку ля локця. Я сам яго ўжо
ня бачыў, але хто быў ля яго, расказвалі, што
тады ён гукнуў немым голасам „ну, цяпер не
магу" і споўз крыху ўніз з узгорачку.

Перад сьвітаньнем мы йшлі ўжо ў цішыні.
Цяпер мы заўважаць пачалі зоры—яны тухлі

на палавым небе і ўсход засьцілаўся бялявымі прасторамі.

Мы йшлі ўсе наступныя дні. Сяляне выходзілі спатыкаць нас. Партызаны далучаліся да нас. Нас цешыла гэта, і вітаньне сялянскіх натоўпаў.

Я цяпер ня ведаю дзе Юры і што з ім. Таксама сышоў з майго дагляду і Скабакоў. Ён нёдзе там, на сваім поўначы Савецкага саюзу. Каб я ведаў яго адрас, я напісаў-бы яму, што вычытаў нядаўна ў нашых беларускіх газэтах. Перадавалася паведамленьне з польскіх газэт: успаміналіся прозьвішчы кіраўнікоў першамайскіх дэмонстрацый у Заходняй Беларусі. Іх вінавацяць у комуністычнай дзейнасьці. Сярод іх вычытаў я імя Паўла Гарэйкі.

Я ўспамінаю: у тую часіну, як распытваў Юры—як спаткалі нас у яго хаце і каго мы там бачылі,—ён гаварыў:

— А сына майго ня бачылі? Паўла? Паўлючка, майго сына?

Чэрвень 1930 г.

---

# МАЛЮНАК

## 1

Першыя мухі гудуць у хаце; найбольш іх над паліцаю, на якой—збанкі, гаршкі... А пад паліцаю вісіць на іржавых цьвікох усё прыладзьдзе вясковае капэльлі: дзьве скрыпкі і бубен. Паліца пад самай стольлю, а ўнізе, пры вакне, над тапчаном сагнуліся Сьцёпка і Раман—гоняць гвазды, цягаюць дратву: Зьмітру Настулінаму да вясельля боты канчаюць. І ў Сьцёпкі, і ў Рамана—галасы хрыплаватыя, але вясёлыя:

— От, брат, абсац выходзіць, як шкло.

— Ты лакам пацягні.

— Пацягнуў.

А ў Сьцёпкавага бацькі голас гучны й шырокі:

— Не шкадуйце вы адно, хлопцы, гэтага лаку, бо Зьмітрок Настулін хлопец—у-га, дай божа кожнаму добраму. Я-ж кажу, хоць к вясельлю яму боты зрабеце, каб аж... хэ-хэ-хэ...

Раману ўжо надакучыла сядзець—цалюткі дзень шые. Ён рад устаць і панесьці да печы паказаць дзядзьку Паўлу бот:

— Вы адно гляньце што за бот!

Вочы яго ня сыходзяць з бота. Барада за гэтыя дні адрасла і здаецца, што гэта ён твар свой нечым запэцкаў—гэтак ня ідзе да яго гэтая чорная пакручастасьць.

— Няхай-бы ты, Раман, пагаліўся, ці якое табе ліха,—падае з печы голас дзядзька Павал.— А то малады чалавек, а барада як дзяркач.

— Дзякрэту такога няма, каб мне кожны дзень галіцца,—аджартаваўся Раман.

— Дзякрэту чакаеш, гэ-гэ,—падаў свой шырокі рогат з печы дзядзька Павал.—Добра кажа, дзякрэту яму няма... гэ...

Дзядзька Павал чэша ў сваіх, даўно няголеных сківіцах, выцягвае з губ малюпаценькі недакурачак, стараецца ўзяць кончыкамі пальцаў, каб не апячыся і зусім камечыць губы.

Ён толькі што прышоў у хату, пасьля доўгага тупаньня па дварэ, па пуні, па сенцах. Усё як-бы шукаў чагосьці. Дзядзька Павал выходзіў за адрынку ў садок, глядзець, што позьняя вясна робіць з дрэвам. А-ж там пайшлі неўза-

метку ніштаватыя такія пупішкі, трава палезла з-пад платоў, крапіва проста аж буяе.

Пахадзіў, патупаў дзядзька Павал па садзе, знашоў раней незаўважаны чарвівы леташні лісток і спароў яго з яблыні кійком. Пасьля закурыў там-жа, на месцы, і падаўся ў хату. Баб кудысьці павыносіла. Дзядзька Павал пабраўся на печ. Бяручыся, кракtануў:

— Хіба задрамаць з паўгадзіны якое.

І адразу як лёг, замахалася у прыжмураных вачох конская грыва. Конь той—худы, махае ўсё хвастом; ён спрацаваны, зрэзаны пугаю ў гадзіну, калі плуг ня йдзе. Гэткі конь пачаў матляцца ў заплюшчаных вачох. Пасьля пачала наплываць першая дрымота, конь тады стаў. Раптам пад нагамі яго зазелянела каляіністая палявая дарога, трава на ёй скрозь буяе паўз каляіны. Конь патрос апошні раз грываю, угнуў мысу ў зямлю і пачаў грызьці. Дзядзька Павал нібыта падышоў тады да каня і правёў рукою па яго шыі. Конь чамусьці натапырыў вушы і глянуў на гаспадара. А вочы тыя!—чыста як крыніца.

— Што гэта ты, гаспадара не пазнаеш?— пакрыўдзіўся дзядзька Павал.

Раптам скакануў конь не па сіле сваёй цераз дарогу кудысьці ў хмызьнякі.

Зусім знацца з гаспадаром ня хоча,—выказаў сваю крыўду дзядзька Павал.

Але адно вецер сьвіснуў паўз вушы. Больш ніхто й не пачуў дзядзькі Паўла. Тады дзядзька Павал паклыбаў дарогаю далей у поле. Нікагутка! Адно над узбалоцьцем кігікаюць кігаўкі. Здаецца, плачуць небаракі, енчаць, просяць чагосьці. Кі-гі, кі-гі.

— От-бо стварэньне,—моцна задума ўзяла дзядзьку Паўла.

Тут зусім ужо сон наваліўся на яго. На печы ня горача, сама што спаць. Якое цяпер паліва— абы гаршок закіпеў. Цяпер бабам самая пара дровы ашчаджаць, а дроў, сказаць, і няма.

І от ужо дзядзька Павал сядзіць на мяжы адзін, сярод ветру. І ні то гэта ён бачыць перад сабою на забаранованай ральлі, ні то проста толькі думае пра гэта. Не, такі сапраўды бачыць: той усё самы конь цягнецца, валачэцца проста да яго, хоча значыцца ўжо з гаспадаром знацца! І чым бліжэй падыходзіць, тым больш парэбрыны ў яго сьвіцяцца пад скураю. Так і ходзяць, так і ходзяць. Хоць пералічы ты іх. Колькі ў каня парэбрын?—пачынае раптам

думаць дзядзька Павал, але тут конь, як-бы ўгадаўшы яго думкі, адвешвае губу, вышчарае зубы і падае голас:

— Нашто-ж ты мяне зрэзаў гэтак пугаю?

Дзядзька Павал бачыць —аж тут ужо (адкуль толькі іх і набралася) паўнюсенька ральля: суседзі, суседкі, так сабе людзі. Дзеці, дзяўчаткі, хлопчыкі...

От і жонка стаіць ля яго, босая, у зрэб'і; робіць, робіць, угнуўшыся ў зямлю і канца гэтай рабоце няма. Дзядзьку Паўлу шкода стала, устаў памагчы, дык і сам гэткі немагушчы стаў. Закалола ў сярэдзіне... Гэта-ж—ці не вярнулася зноў тая хвароба, што мучыла яго некалькі год? З чаго? З працы, з работы вялікае. З бядноты, з холаду, з бяды, з гора... Падверадзіў плечы, рукі, ногі... А папраўіцца ня было чым. Дык цяпер раптам страшна стала дзядзьку Паўлу: зноў тая немач вярнулася, ад якое ледзьве адхаяўся!

А тут навакол, на ральлі, дзеці вясковыя: абшарпаныя пасгушкі, з паабдзіранымі нагамі, бяз сну, бяз догляду. Малыя зусім дзеці, пузатыя, віхрастыя, недагледжаныя. Маткі, стараючыся сьцішыць іх ад плачу, сьпяваюць над імі калыханкі, затыкаюць ім раты суслам і ў жа-

ванага хлеба. Песьня тая—дык здаецца гэта не сьпяваюць яе над малым дзіцем, якое напроці свайго веку стаіць, якое гадуецца каб жыць, а здаецца гэта нябожчыка праводзіць на той сьвет—гэткая тая песьня!

— Я-ж адцураўся ўсяго гэтага!—стараецца гукнуць дзядзька Павал і ня можа, сон душыць яго.—Я-ж атрапаў рукі ад усяго гэтага!

2

— Дзяньдобры ў хату.

Сьцёпка павярнуў галаву да дзьвярэй, каб убачыць чалавека з гэткім знаёмым голасам.

Цераз парог спачатку шкрабянула крывая, як кульбака нага, пасьля чырвоны твар, пасьля падаліся ў хату плечы і тады ўжо, значыцца, увесь чалавек быў у хаце.

— Эгэ, дзядзька Мудрэйка!—прывітаў яго Раман.—Ці ня з лазьні вы гэта?

— Чаму?

— Нешта твар у вас дзядзя вельмі распараны?

— Ай, няхай ты запаветрай, ты ўсё жартуеш.

— Якія тут жарты. Праўда, няхай хоць сам Сьцёпка скажа.

— Праўда, дзядзька, што вы вельмі ружовенькі,—і Сьцёпка падміргнуў Раману

— Ружовенькі, кажаш...э... што тут таіцца.

— Разгаўляліся, значыцца?

— Разгаўляўся. Тут, значыцца, як вам сказаць... Значыцца, каб ня схлусіць, падаўся я гэта быў зранку у мястэчка, дый там, каб ня схлусіць... учора гэта было.

— Цэлы дзень? А хто-ж за вас рабіў?

— А ўчора-ж нядзеля была.

— А, праўда, учора-ж нядзеля была. Я й забыўся.

— Няўжо-ж гэтак як вы, сьвята такі й сапраўды адцураліся. А яшчэ, каб ня схлусіць...

— Дык гэта было ўчора, а сёньня чаму вы гэтакі ружовы. Няйначай, такі, ў лазьні парыліся.

— Дай сьвет. Гэтак мне нядобра было пасьля ўчарашняга, што мусіў сёньня...

— Ага! Значыцца...

— Значыцца, дык, ацеліцца... Чаго гэта бацька на печы ляжыць, а ты мне кажаш, што ўчора хто за мяне рабіў!

— Бацька выходны сёньня.

— А, от што. Выходны. Эй, ты, колгасавец, злазь з печы.

Дзядзька Павал не пакарушыўся нават. Ён спаў.

— Сьпіць як пшаніцу прадаўшы. Э-э!

— Нашто ён вам, няхай засьне.

Памаўчалі. Мудрэйка сядзеў на лаве, адставіўшы нагу. Пасьля ўспомніў:

— Бывала, я памятаю, у ўездным прысуцьсьцьвіі быў пісар, дык—от выпіваў!..

— А гэта быў ваш сваяк, ці як?

— Гэ, чаму сваяк. Я там і так усіх ведаў як лупленых. Я ўезднае прысуцьсьцьвіе усё навылёт ведаў. Колькі я бывала прашэньняў пападаваў туды.

Яно такі й праўда. Гэта ўсё ведаюць. Мудрэйка за свой век папасудзіўся з усімі. Усё падаваў прашэньні, падаваў скаргі, пасьля зноў прашэньні, што каб скасавалі справу, бо ён добра быў не разабраўся, калі падаваў прашэньне. Пасьля зноў прашэньне каб аднавілі справу, бо „цяпер ён ужо добра разабраўся і ніяк не памыліцца гэты раз“. Адным словам, году ня мог прасядзець чалавек, каб не адбыць судоў зпару. Часамі праз гэта сама у бяду ўскочыць, а не сядзіць ціха. Любіў чалавек, можа сказаць, канцаляру. Нават у яго ў хаце ў самога, як-бы канцаляра была: на паліцы

куча нейкіх, усё з-за гэтых спраў пасьпісваных папераў. Пылу на іх было—страх што. Такі й любіў Мудрэйка сваё „уездное прысуцьсьцьвіе“.

— Дык гаспадар, значыцца, сёньня выходны?

— Але дзядзька Мудрэйка.

— Колгасавец, значыцца, выходны, значыцца! А ўрача, у нядзелю рабіў?

— Рабіў, дзяцька Мудрэйка.

— М-гу, рабіў, значыцца.

— Рабіў, значыцца. Нядобра, праўда, дзядзька Мудрэйка?

— Ат, мне што. Хай сабе праўда, хай сабе няпраўда. Я такі чалавек: цяпер што! Цяпер, я-ж кажу, дзень пражыў і...

І дзякуй богу, праўда, дзядзька Мудрэйка.

— А што-ж! Як цяпер народ жыве! Народ цяпер жыве гэтак, што... Што-ж гэтыя, хоць-бы сабе й колгасы. Гэта добра, калі дзе колгас добры пападзецца адразу, што ўсё там ёсьць, што там і хлеба хапае, і ўсяго. І сала; сьвіней там многа...

— Адным словам гэткі колгас, у які бог з неба ўсё скідае, а калгасаўцы адно падстаўляюць раты, ды ловяць. Зловіць, глыне, дый зноў разьзяўлены рот падставіць. А бог зноў

зьверху—ляп у гэты рот. Гэтак, дзядзька Мудрэйка?

— Што ты брыдзеш.

— Ну а як-жа! Вы калі ў колгас самі падавацца будзеце?

— Буду бачыць.

— Тады, мусіць, калі ўсё ўжо там будзе гатовае. Калі ўсё ўжо там наладзяць цяперашнія колгасьнікі? Цяпер-то яно, праўда, і не хапае таго-сяго. Але затое людзі стараюцца, робяць, каб набыць. Дык тады й рабіць лягчэй будзе, і жыць латвей. А вы каля гатовага агню любіце рукі пагрэць.

— Ат.

— Ат, ня ат, а гэтак яно выходзіць.

Тут падаў голас Сьцёпка:

— Не, дзядзька Мудрэйка хоча раскідаць колгас, ды на яго месца ўезднае прысуцьсьцьвіе зрабіць.

Мудрэйка сядзеў і пакручваў адно крывою нагою.

Раман нагнуўся над абсацам. Сьцёпка скончыў бот, адклаў у бок і здалёк акінуў яго вокам: бот быў як цацка.

— Цьфу, каб ты згарэла, вярзецца нешта!— мармынуў, усхапіўшыся раптам за комінам дзядзька Павал.—Цьфу!

Плюнуў у сьцяну, перакруціўся на другі бок і зноў апанавала цяжкая дрымота: Дрэмлючы чуў як пахла ў хаце новымі ботамі—дзёгцікам патыхаюць боты; кіслым малаком нясе недзе з паліцы; з-за вакна чуецца вясёлы бабскі рогат і дзіцячы плач... А тут ужо дрымота зусім адабрала думкі і от ужо... (ці гэта со сну, ці сапраўды гэта ўсё на двары робіцца)—недзе плюхае вада. От ужо й сапраўды бабы палошчуць бялізну. Халодная гэткая прыемная, вада сьцякае ў іх па белых руках і плюхае, а навокал сьпяваюць, аж залягаюць, пеўні, кудахчуць куры, гвалтуюць вераб'і, так яшчэ нейкія дробныя птушкі шчабечуць. А гэта ўсё глушыць вялы, як тандэтная кілбаса, мудрэйкаў голас:

— Ат, жыць цяпер, дзень перабыў, дык і хвала богу.

— Гэта вы пра сябе, ці пра каго?—пытае раманаў голас.

— Так, як сказаць, пра ўсіх.

— Вы на свой мэтр увесь сьвет перамералі, ці як гэта?

— На мэтар, на шмэтр, ты вельмі разумны нешта стаў, пане Рамане.

Тут Сьцёпка паддаў жару:

— Ён, сказаць, і ніколі не падаваў прашэньня, каб яго прынялі ў дурную каманду.

— Но але,—падаў голас Раман, —добра кажа, прашэньня. (А пасьля памаўчаўшы) —у ўезднае прысуцьсьцьвіе...

— Цьфу!—плюнуў Мудрэйка.

І тут ужо ў дзядзькі Паўла дрымота пачала праходзіць. Тут ўжо думка, самая сапраўдная, як дратва ў тавар, пайшла ў мазгох.

Учарашні дзень. Калгасаўцы аруць. Трактар проста такі есьць зямлю. Няма яму ні дзірвану, ні пырніку: рве, грабе, ломіць, крышыць... Трактарыст адно пасьвіствае, адно падміргвае навокал. Дзядзька Павал, за платамі, параконным плугам арэ колгасаўскія капусьнікі. У сьвінарніках пішчаць парасята, рыкае цельная карова дзесьці ў аборы... Веснавы вецер дае проста ў твар дзядзьку Паўлу.

— Гатова!—гукае Раман і адкідае бот на тапчан.—Цяпер Зьмітрок пару ботаў мае—хоць на выстаўку.

— Сьвяточныя боты,—падае голас Мудрэйка,—у сьвята абуцца, або ў выходны дзень... хэ-хэ-хэ...

Пачуўшы мудрэйкавы кепікі, Раман не перапусьціў:

— Не нашто ў выходны дзень, калі найлепш у нядзелю. Абуўся, значыцца, пайшоў сабе ў царкву, пацалаваў там пасьля малітвы куды належыць, пасьля пацалаваў яшчэ папу ў гэтае, значыцца, у руку, пасьля падаўся дадому, падпіў, даў жонцы па карку. А то проста, пашукаў сабе добрае канпаньні, каб памясіць каго кулакамі...

Тут ужо Мудрэйка спусьціў нос і пастараўся пусьціць гаворку ў другі бок:

— Кажуць, што на паплавох яшчэ вада стаіць.

І залажыўшы нага на нагу, каб ня тырчала лішне на хату крывая, што была калісьці, яшчэ перад вайною, перабіта, недзе на нейкім фэсьце.

Раптам дзядзька Павал пачуў, як, смык паспрабаваў струны на скрыпцы.

Сьцёпка трымаў скрыпку ў руках, зусім гатовы смальнуць па струнах. Раман настройваў сваю.

Зьмяркалася. Бабы пакінулі на дварэ пала[с]каць бялізну, адно пра штосьці мацней ящ[э] загаварылі, мацней засьмяяліся. Мухі аселі на паліцаю, гулі цішэй.

Музыкі ўтнулі польку. Раманава скрыпк[а] проста такі загаварыла. Сьцёпка пайшоў па[д] утур. Дзядзька Павал адкінуў ад сябе дрымоту, чухануўся плячыма аб камін, усхапіўся, шалыгнуў на край печы, разьвёў рукі і замахаў імі ў тахту да музыкі, як капэльмэйстар.

— Паддавай, паддавай, хлопцы, сып, сып!— гукаў дзядзька Павал.

— Ня гэтак. Ня гэтак, кажу табе, махаеш!— ускіпеў Мудрэйка,—што ты махаеш адно ўбакі, управа і ўлева, трэба кажу табе, і ўгару і ўніз. Я ведаю як махаць трэба! Я калісьці як сьпяваў на клірасе, дык дзяк...

— Пайшоў ты з сваім клірасам.

Тут ускочыў у хату бубнач і схапіў з-пад паліцы бубен.

І як утнулі яны марша, дык да хаты пачаў зьбірацца народ

1925 г.—1930 г.

---

1

Дыхнула вясна і зямля стала вясёлая.

У прагным жаданьні парыліся ўзгоркі, лаг-
…чыны купаліся ў тумане. І гулкая, ні-то цішыня
…шырокіх размахаў, ні-то песьня веснавое вясё-
…лае журбы, плыла над зямлёй. Зямля чакала
…часу ўзьняць сабраныя сілы сваёй творчай
…здольнасьці і ў лагчынах драмала пад сонцам;
…драмала з подыхам шырокім сіняму небу.

Ночы былі звычайныя, далёка-гулкія і пахлі
вадою, бо вады на зямлі было многа.

Як чакала зямля людзей у свае палявыя
палосы, таксама і людзі чакакалі зямлі,—чакалі
яе, падсохлую, новую. Бо ўжо паіржавелі за
зіму плугі і бароны, і грудзям надакучыла ды-
хаць паветрам шчыльна заткнутых хат.

І яшчэ чакалі людзі: прычакаўшы вясны
аднэй, чакалі другой. Зямля была яшчэ чорная,
лясы былі сінія: гэта пара ад зямлі агортвала

іх, яны-ж агортвалі сабой людзей. Ды яшчэ ці мала людзей блыталася па нізкіх кустох, па мокрых алешнікавых паплавох, у гушчарніках лазовых за рэчкамі. Гэта вясна дазволіла ім пакінуць вёскі. Прапахлі людзі гэтыя вільгацьцю веснавое зямлі, вясёлымі імхамі. І начамі цягнуліся па родных мясьцінах.

Сяк-так зьбіраліся задаволіць зямлю плугамі, але і ў гэтым зьбіраньні была нязвычайнасьць, як-бы было гэта ўжо няважна перад тым нечым, што недзе рабілася, што было і гаварыла пра сябе ўсюды.

З самага вечару яшчэ вёска прабавала трохі гульнуць дзявочымі песьнямі, ды хутка сьціхла, толькі часам груне дзе за гумнамі моцная лаянка раззлаванага на ўсё чалавека. Вечары баязьліва туліліся да зямлі, а людзі начамі баяліся. А пасьля ночы дзень прыносіў многа новых гаворак, дзівосных думак, і чутак.

Слова мужычае—як гром. Мала што яно баязьлівае часам, але затое шырыня і размах у ім бясконцыя. І стараліся ня мець лепш справы з гэтымі словамі тыя, што мелі тут сілу: прыяжджалі яны ў вёску, калі ім трэба было, крычалі тут, махалі нагайкамі, вынаходзілі ўсялякія прычыны, каб перацягнуць мужыка па

сьпіне, цешыліся бляскам сваіх гузікаў, ды белага арла на шапках і, нацешыўшыся, выяжджалі. І даганялі іх моцныя мужычыя словы, звычная лаянка, хрыпата крыкаў нянавісьці.

— Гых вы, трасца вашай мацеры..

А тут яшчэ хвароба нейкая на жывёлу ўкацілася. З хлява Саўкі Чужахвала пачалося: дзьве каровы, як горы, за платамі, на балоце ляжалі—Саўкава і суседняя. Пачало не хапаць межаў людзкое злосьці.

2

Стараста ня выцерабіў з-за каўняра і з вусоў мякіны і сечкі, не абцёр з твару пылу, з торапу зашпіліў пад расхрыстаным кажухом камізэльку верхнім гузікам на ніжнюю дзірку і перабягаў з-пад вакна да вакна:

— Мацьвей, вечарам на сход валі.

— Цётка Кацярына, гані там вечарам Паўла на сход, тры каровы сказана даць.

— Саўка, вечарам сход; ад дому не адлучайся, малоць заўтра паедзеш. Чорт яго бяры з млівам, тры каровы, выразана сказана.

— Няхай ім тры скулы.

— Тры мала; каб хаця тры тысячы.

— Гэй, ты там вечарам на гэтае.

— Ведаю, чорт яго пойдзе. Хто гэта дур
пацягнецца.

І ўсюды была халодная сьцяна слоў:

— Няхай ідзе той, каму ўсё гэта трэба.

Аднак, вечарам цёмныя сьцены здавалі
сябе густы гул галасоў. Слухала поле людзе
сваіх. Шырока расплывалася мужычае слов

— Гэта-ж, каб іх пяруны, сваё ўласн
давай, ды яшчэ чакай гадзіны тры кожну
сволач, пакуль задумае зьявіцца.

— Пакуль, добра кажа, зьявіцца, гляне.

— Няхай яны на сьвет не глядзяць.

Але затарабанілі калёсы па прымёрзла
нанач зямлі. Нізкі і тоўсты ўкаціўся ў школ
Глянуў на народ, падышоў да стала.

Важна, злосна, па-панску казаў:

— Дык вы-ж ужо ведаеце, тры каровы па
вінны назаўтра да поўдня даць з вёскі. Ка
торы тут стараста?

Стараста крактануў, коса паставіў вочы
выпхнуты з грамады пруткімі рукамі, выша
наперад і нехаця загаварыў:

— Ці ня можна-б, паночку, скідку якую
зрабіць, гэта-ж і так хвароба нейкая ўкацілася
хоць ты гвалт крычы. Наша справа мужычая
давай, а дзе ўзяць?

Тоўсты нешта хацеў сказаць, але загулі галасы:

— Але ці парадзіў нам хто, як лепш пры-бацьь гэтую жывёліну, га?

— Дык вы павінны, паночку, сказаць нам, каго прасіць гэта з тым, каб паменшылі.

— Мяне прасіць,—адказаў той,—я самы старшы; але нічога ня будзе. Скідкі ня можа быць. Тры каровы да заўтрашняга паўдня.

— Можаце, паночку, і цяпер узяць. Загадайце адно свайму фурману паехаць і забраць.

Гэта Саўка Чужахвал вылез наперад.

— Што забраць?

— Каровы. Дзьве каровы, як горы, зусім яшчэ сьвежыя; я толькі ўчора за платы выцяг-нуў. Нават і прымерзьлі крыху, так што мяса ня трэба ні саліць, ні ў лядоўню цягнуць.

— Гы-гы,—грунулі ззаду рогатам.

— Добра, кажа, за платамі мёрзлае мяса, леж—хоць расьперажыся.

— Го-го. Гы-гы.

— Вось дык адкаціў!

— Цябе, як зваць?—гукнуў таўсты і пала-жыў руку на стол.

Саўка шмыгануў назад у грамаду, толькі абле-злы кажух яго матнуўся перад сталом.

— Як звацъ яго?

— Саўка Чужахвал.

— Гэта што сыноў двух у лес паслаў, партызаншчыну разводзіць, ды мужычае права сваё паказвае? Я цябе, як міленькага прыбяру.

Зноў загулі, зноў прыціхлі. І заднія пачалі ўцякаць са сходу.

У востраў цішы сырой веснавой ночы ляпалі лапці па зямлі, кашаль і ахрыплыя галасы разыходзіліся па вуліцы. Чула-дрымотнае поле прымала іх і разносіла па туманных лагчынах.

Саўка Чужахвал заўсёды кашляў, а гэта і зусім закашляўся на дварэ. У злосьці і крыўдзе прышоў ён у свой двор. А ў хаце адна дзяўчына, дачка, Насьця,—гаспадыня ўжо. Трывога была ўвесь вечар і ноч у Саўкі Чужахвала. Ад кашлю яшчэ горшая была напружанасьць усяго. І думкі былі, як стук абухом у сырое бервяно.

Голас у Насьці срэбрам разышоўся па хаце:

— Ты чаго, тата, спаў-бы.

— Ведаюць, што хлопцы ў лесе. Запісаў мяне на сходзе сёньня тоўсты, каб ён спух.

У плач кінулася Насьця. У сьлёзы гаспадыні, што выведала ўжо ў маладыя гады хатнюю

таўкатню. Плач яе быў ціхі, з прыслоўямі, кабечы.

— Чаго ты? Што гэта паможа. Яно, пэўна, бяда, але чорт яго бяры. Што будзе, то будзе. Ня я першы, ня я апошні. А што да цябе, дык табе што? Твая справа хатняя.

Ня сьціхла Насьця, і Саўка на двор пацягнуўся. Ляпнуў дзьвярыма, каб Насьця бачыла, что і он неспакойны.

Грукалі па суседніх хлявох коні. На пры-гуменьні, каля шэрай сьцяны бялела салома. І зноў былі думкі стопудовыя:

— Гэта ж памерла яна, жонка, без пары. Ад бядноты, ад гора захварэла і памерла. А сама, што жыць яшчэ ёй было. Тут жыцьцё кончылася ад убогасьці, ад недастач, ад галодных і халодных дзён, там ён з сытасьці, тоўсты, ня ведае, што рабіць. І яшчэ мае права запісваць мяне, над маім жыцьцём сілу ў лапах трымае. Вось гэта-ж крыўда ў тым ўся, што над тваім жыцьцём над днямі тваімі сілу мае.

Насьця сьцішылася апоўначы, плюхалася ў мыцельніку мыючы гаршкі.

— Я яго забіў бы, каб дзе сустрэў, ды зручна было,—сказаў Саўка да Насьці.

— А божа-ж мой,—зноў заплакала Насьця.

І ноч прайшла ў неспакойным сьне. „Можа яно і забудзецца пасьля, але вострымі бываюць першыя хвіліны“, гэта думала Насьця скрозь дрымоту, як думаюць і адчуваюць перад важным здарэньнем, або пры вялікай радасьці.

### 3

У Саўкі Чужахвалава конь — проста нялюдзкая справа: лапавухі, востразады, худы як дошка, пад касматай скурай рэбры тырчаць, як частакол. Дай яму сена, — а ў яго й пажаваць няма чым, сьцебані яго пугаю, — а ён возьме ды ляжа там, дзе стаяў. За зіму надакучыла яму цёрціся шыяю аб цёмныя сьцены ў хляве, а тут якраз праз шчыліны лінулася ў хлеў вясна: мусіць гэта сакавік прынёс з паплавоў водыр ветраных прастораў, волю рачных берагоў. Бо ўжо зеляніла з зямлі вяршкамі трава і каляіны на дарогах абветралі. Лапавухі ў хляве натапырваў вушы ў дзікай нецярплівасьці, цёрся мордай аб дзьверы, глядзець не хацеў на параную сечку. А раз пад вечар, як Саўка забыўся зачыніць у хляве дзьверы, драпануў лапавухі ў поле: адно бліснуў паўз вокны.

Па полі гуляў лапавухі. Трос аблезлай грывай, падкідаў вострым задам, цягаўся каля ку-

стоў, грыз нешта на голых межах. Саўка бегаў за ім, засопшыся, Голас у Саўкі быў сярдзіты, хрыплы ад кашлю:

— Каб ты спруцянеў, каб ты, падла лапавухая.

Не падаваўся конь; а пасьля прыпёр яго Саўка да самае рэчкі ў куток балота. Па чэраве ўехаў лапавухі нагамі ў нейкае крынічышча—там і хапіў яго Саўка. Узьлез на яго худую, як ражон, сьпіну і сьцебануў ламінаю пад чэрава.

— Но, цягніся. Няхай цябе ўпадкі, намучыў ты мяне сёньня.

Конь выцягнуўся на дарогу, ды стаў рачтам. Натапырыў вушы, разьдзьмуў ноздры. І прышлося Саўку ўгледзецца ў сівы змрок адвячорку. Там недзе імчаліся коні. Хутка падбеглі. Ды сытыя, вараныя. Коні, як печы. А на іх людзі, як шкло, чыстыя: адзін, як сьвіньня, тоўсты, другі тонкі, як бізун, зусім яшчэ малады.

„Гэта-ж той самы, што ўчора ў школе на сходзе быў“, дадумаўся Саўка і, зьвярнуўшы, спалохаўшыся, свайго лапавухага на бок з дарогі, ткнуў лапцямі ў бакі яму, каб хутчэй бег ад ненавідных людзей. Але ня так-жа лёгка

павярнуцца лапавухаму, а тым, як Саўку плюнуць, праімчацца паўз яго. Саўка адно азірнуўся. А той маладзейшы, у сытай вясёласьці ад лёгкага жыцьця, сьцебануў з ласкі на пацеху лапавухага па азадку ды гукнаў кпліва на Саўку:

— Эй гвардзеец!

Вялікая нянавісьць нарадзіла ў момант ручаіну нястрыманай злосьці. І голас Саўкі страсянуў хрыпам сьветлы змрок:

— Каб на вас агні, каб на вас.

Ня чулі, мусіць, тыя, бо імчаліся далей. Саўка ехаў адзін паволі вузкімі палявымі сьцежкамі. Злосьць зьмяшалася з крыўдаю цяжкаю, вялікаю, як каравы мазольны кулак.

І пачуцьці ў Саўкі на ўвесь сьвет крычалі: „Гэта-ж сытыя, ды яшчэ кпіны на кожным кроку. У мяне ад галоднага жыцьця мерлі ў сям'і, а там—сытасьць празьмерная. Ды што-ж гэта такое, што насьмешка такая, як-бы над чарвяком якім. Ды яшчэ-ж запісаны ў яго, з таго самага сходу... Ды яшчэ-ж сыны мае два па лясох туляюцца. Яшчэ невядома, што з гэтага будзе... Трэба што-небудзь рабіць...“

— Тата,—сказала дома Насьця плачучы:—прыходзілі ды казалі, каб заўтра явіўся ў двор, дапытвацца пра хлапцоў будуць.

— Яўхім дома ці не?—сказаў Саўка Чужахвал, адчыняючы дзьверы.

— Яўхім у гумне, — адказаў бабскі голас з цёмнае хаты.

У гумне пахла адсырэлаю аўсянаю саломаю і жытнім пылам. Яўхім шамятаў кулямі ў таку. У гумне ніхто ня шкодзіў гаварыць і абдумваць вялікую справу.

— А тымчасам братка ты мой! На допыт заўтра возьмуць. Прападаць, значыцца, давядзецца. Падвёў д'ябал яшчэ мяне на сходзе тады пра мерзлае мяса за плотам слова ўвярнуць.

Шапталіся доўга. То ў роспачы, то ў крыўднай злосьці павышалі галасы. Панура перасыпалі словы моцнай лаянкай, ды як-бы баязьліва часам, а часам праз меру моцна і сьмела. Лез ў душу смутак. Ішло змаганьне ў чалавечых істотах. Змагаўся розум з пачуцьцём. То адвага вялікая, нястрыманая зьяўлялася, то пахілая слабасьць. Ды толькі думкі бралі істоты пад сваю ўладу. Думкі паказвалі, што надышоў час, калі адарвуць ад родных хат, могуць пагнаць чорт ведае куды, камандаваць жыцьцём, як

жыцьцём чарвяка. Ды яшчэ крыўда расла і шырылася.

І голас у Саўкі стаў раптам рашучым:

— Будуць удвух ехаць яны назад неўзабаве, заляжам у кустох ды забіць папрабуем. Усё роўна на тое пайшло. Эх ты.

— Хоць раз за ўвесь век кпін.... Яно гэтак... А што думаеш...

У вільгаці старога, цёмнага гумна выршалася справа жыцьця. Бяздоньне сіл і жаданьняў бушавала ў людзях. Праснулася і загаварыла бязьмерная нянавісьць пакрыўджаных людзей. Крычала яна ў пачуцьцях і думках, ды толькі не магла складана выліцца ў словах. Ня прывыклі людзі за жыцьцё гараваць многа. Толькі песьня выяўляе часам пачуцьцё. Больш ўсё кідалі нясkладнымі словамі.

— Што-б тут узяць, чорт яго ведае.

— Што возьмем, тое і добра будзе. Абы вагу мела.

— Ну дык што-ж.

— Хадзем хіба.

Ні Саўка Чужахвал за пяцьдзесят два гады жыцьця, ні Яўхім за сорак восем год жыцьця, жабы без патрэбы забіць шкадавалі, а гэта ўночы на чалавека ісьці адважыліся.

Над зямлёю драмала вясна ў ясным змроку, ад вясны зямля дыхала сьвежаю параю ды піла шырыню маладой лёгкасьці. Ноч маўчала, была звычная далёкай пустатой.

У хаце плакала Насьця, выпраўляючы Саўку, бацьку з хаты; галасіла блізка ў хаце другая жанчына з імі двума, за гумнамі, цераз агароды. Правялі іх далёка ды з плачам і смуткам, з жаночым горам пайшлі назад мокрымі паплавамі. Змрочна было ў паплавох, ціха ў палёх, цёмна ў жаночай душы. У жанчын было няведаньне, што гэта сёньня ідуць забіваць чалавека. А ў тых ужо было толькі адно нястрыманае жаданьне.

5

— Як яшчэ невядома прыдзецца. Можа нічога з гэтага ня будзе...

— Валі на ўсё, усёроўна да дому варочацца няма як. Па лясох пажыць давядзецца.

— Знай, што адарваўся там ззаду.

— Што будзе то будзе, харкні ды плюнь.

— Але, як табе плюнуць!

— Нямала плявалі. Годзе!

— Бярэ страх. Усё-ж-такі...

— Не гавары. Няхай яго агонь спаліць. Нязвыклая справа.

— А думаеш ты пра яго, на каго з доўбняю ідзеш?

— Ужо не. Але ўсёроўна. Кончана... Пачакай, думаю. Само думаецца. Гэта-ж я галодны быў заўсёды ды бяз сну галава, як сто пудоў; а ён... Гад такі...

— Пачакай, а варочацца ня думаеш зараз-жа?

— Заўтра ўсёроўна забяруць... Ды што ты з мяне вымучваеш? Хочаш—сьвісну.

Але ня сьвіснуў, а закашляўся Саўка Чужахвал.

Боты плюхалі па мокрых паплавох.

6

... Над зямлёю драмала поўнач, за куп'ямі ціха гаманіла рэчка, дарогі зусім спалі ў мокрых палёх. У кустох лазіў густы змрок, аглядаўся ў поле, абзываўся птушыным сьмехам, пасылаў доўгія свае цені да самай дарогі. А пры дарозе дбалі двое людзей. Зусім зьліліся жоўтыя кажушкі з зямлёй, зусім, з няпрывычкі да вострай, ніколі нябывалай хвіліны,

няпоўнымі былі думкі—кідаліся ў бакі, ападалі да бяздум'я, ускідаліся, ахоплівалі сабой усё жыцьцё і зямлю. Як у час, што мяжуецца між жыцьцём і сьмерцю. А то хітра завівалася думка, што ўсе так сыйдзе жартам, што жарт гэта, бо як гэта можа быць, каб вось нічога гэта, бо як гэта можа быць, каб вось нічога ня было такога ў жыцьці, а то раптоўна зроня было такога ў жыцьці, а то раптоўна зробіцца—уласнымі рукамі заб'еш другога. А то ўскіпіць ручаінаю нянавісьць, страшная злосьць, зашчэміць губу між зубамі, сьцісьне моцна пальцы рук.

Даўбешка, што калоў Саўка Чужахвал дома дровы, была пашчапаная, пабітая, цяжкая і задровы, была пашчапаная, пабітая, цяжкая і замашная; лапата, што ў вольны час хадзіў Яўхім па людзях капаць студні, была вострая, добра магла прыстаць да чаго хочаш. Гэта-ж ня было нічога іншага пад рукамі, як выбіраліся з дому.

Ад халоднае вільгаці і нэрвовасьці зусім хрыпеў голас Саўкі:

— Гэта-ж бабы нашы і ня ведалі, нашто мы доўбню ды лапату валаком з сабой.

— Не канечне, каб і ведалі: от уцяклі ў лес, ды і ўсё тут.

І абодва адчувалі пад сабой зямлю вяснавую, родную. Ліпне яна к людзям ды плугоў

чакае, жджэ шырынёю палёў сваіх. Ужо дыхнула яна апошняю зімоваю парай, гукнула заклікам сваім. Ды не хапае сіл адгукнуцца ёй, укрыць яе сілай сваёй. Бо разышліся сілы па лясох па далёкіх абшарах. А яны Саўка з Яўхімам, нядужыя ўжо, дый ім сваю малую сілу не даюць прылажыць у свой час да зямлі. Ды яшчэ ходзяць па ёй, па гэтай зямлі, другія людзі, гардую ўладу сваю раскінулі над ёю і людзьмі яе.

Дарога чуць-чуць бялела наперадзе шэраньню яснага, падсохлага ўзгорку, а можа гэта водблеск ад палявой вады падаў на яе. І на яе яснасьці заварушылася чорная лапіна.

— Яўхім, назад паўзі.

— Даўбешка ёсьць?

А ён ехаў адзін. Тоўсты, як хмара, шырокі ўночы. Здаволена гойдаўся на сядле, а конь вараны сыта гойдаў задам, тупаў нагамі, чмокаў падковамі па вільготнай зямлі.

— Ціха.

— Адпаўзьлі трохі назад.

Мусіць, прыгледзеўся ён на агні за рэчкай на гары роднага маёнтку, бо не глядзеў уніз. Толькі конь разьдзьмуў ноздры ды фыркнуў. І было ў ім здаваленьне нечым.

„Гэта-ж адзін якраз, біць зручней“, мільгат-
нула у абодвух людзей думка.

Сьціснулася ўсё нутро ў адзін цьвёрды жмут, як камень цяжкі і моцны. Стукнуў ён у грудзі, дашоў да горла і раптоўна вышаў ужо як-бы сьвістам бясконцага ўдалага разгулу. Толькі цела трэба было мацней да зямлі прыціснуць, а то яшчэ ўгледзіць, сьцебане па кані і згіне; ды лёгкае-ж яно нейкае стала, не ўяжджае ў зямлю, а тырчыць, здаецца, вышэй за ўсё поле.

— Гых-х!

А-ж страсанулася Саўкава істота ад рашучай натугі. Доўбня—сухі дуб, вельмі-ж прыстала да панскай патыліцы. Аглушыла, тупа трэснула. І ўсё на гэтым. У Варанога перапалох прабег па скуры, узьняў ногі над зямлёй,—бо дзьве цёмныя постаці матнуліся—адна ззаду, другая збоку,—драпануў Вараны ў кусты направа. Абадраў аб каравы пень на баку скуру і залапатаў капытамі ўніз, к рэчцы. Дыхнулі адтуль паплавы, запахлі лагчыны. Толькі цяжка было імчаць пад сабой чалавека, зачэпленага нагой за стрэмя. Закруціў галавой, зафыркаў Вараны. Два разы падкінуў задам вышэй кустоў, скочыў з усіх чатырох цераз рэчку ў ва-

ду ды куп'ё і адарваў чалавека. Толькі тупа плюхнуў шырокімі плячыма ў ваду.

І драпануў Вараны ў паплавы з пуду, аж зямля застагнала.

А хутка за ім, па яго сьледзе, пералезьлі цераз рэчку двое людзей. Азірнуліся на пакіненыя ззаду кусты ды пайшлі паволі к лясом. Усё ўжо было зроблена, наперадзе лес ды далейшае падобнае, каб цераз гэта зноў вярнуцца.

7.

Мусіць, здорава бегаў Вараны, бо здалёк дабягаў да вушэй тупат капыт ды часты брэх вясковых сабак. На палявыя дарогі, мусіць, выбіўся Вараны.

Тры дні плаваў па вадзе вецер, зганяў яе да берагоў ды кудлачыў яе белаватую роўнасьць. А на чацьверты дзень паразганяў вецер хмары на небе, і, як глянула сонца, спалохаўся таго, што сам нарабіў, ды ўцёк за сінія лясы. А вада асталася глядзець у неба ды сьмяяцца яму золатам сонечных іскраў.

Ужо зелянелі пад сонцам чароты ды плюшнікі, ды асака цягнулася вяршкамі з-пад вады. Толькі была яна пасохлая, старая. Яна тры

дні сьпявала пад ветрам сіплую песьню, цяпер маўчала над чыстатой вады. Сохла зямля, цягаліся на ёй худыя коні, адчуваючы ўжо за сьпіной плугі і сурамець пугі.

Коні маўчалі, вецер уцёк, і асака не сьпявала, але ўсё-ж над вадой шумна было.

Да вадзяных берагоў падыходзілі сабакі, нюхаючы паветра, выцягнуўшы мокрыя морды, ды яшчэ ўглядаліся ў сьляды, што пакінулі ўночы ваўкі. Ды яшчэ над вадою нізка кружыліся вароны, сядзелі на куп'ях пры самай вадзе.

За куп'ямі і лазовымі кустамі тырчэла з вады панскае чэрава. У сытай вясёласьці стаяла на ім варона. І чым мацнейшы быў сабачы брэх на беразе, тым мацней крычала яна, памінаючы пана.

Сакавік, 1925. г.

# Б У Р Ы

У ціхіх скаргах няпрыбранага жыта чуў я вялікія буры.

За многа вёрст адсюль узрываліся камяніцы, на чыгунках рваліся цэлыя паязды, а тут ня было вялікага стуку. Тут проста гарачымі днямі асыпалася перасьпелае жыта і начамі ціха гарэлі вёскі—сьмерць у цішы страшней за раптоўную сьмерць у бурах.

Тады жах панаваў над зямлёй; з чорным дымам плыў ён над дарогамі. Быў ён у бляску сонца, і ў трывожным шуме жыта. Яно, месцамі зжатае, валялася на зямлі ў расьцярушаных мэндліках; рэшта—высыпалася на зямлю сьпелым і перасохлым зернем. Цяпер яго ня жалі і не вязалі, і дарогі былі пустыя і нудныя.

Гэтая нуда, перамешаная з жалем і нездароваю, нервоваю, вастратою, была і ў яго шы-

рокіх змучаных бессаньню вачох. Я спаткаўся з ім каля глінішчаў пры кустох і пры вузкай палявой дарозе—ён сядзеў на пыльнай каляіне, падабраўшы пад сябе ногі, і глядзеў на сухую пакутную галаву каня. Конь худы, страшны сваёю худзізнаю, ляжаў, выцягнуўшы мокрую шыю, на гарачай ральлі, хроп і раз-по-разу шараваў нагамі па зямлі.

Ён паглядзеў моўчкі на каня і на мяне, ад хваравітасьці памаргаў вачыма.

— Палякаў ня відаць?

— Ня відаць.

— Нашых ня відаць?

— Ня відаць.

Цяжка было разабраць, дзе фронт. Учора была наша разьведка, сягоньня ж раніцою, ледзь дзень, у разьбіўку, невялікімі кучкамі, сьпешна прайшоў польскі полк.

Цяпер запытаў я:

— Здалёк?

— З-за Нясьвіжа.

— Далёка былі загналі?

— За Бабруйск. Заставілі везьці нешта. Што—сам ня ведаю—от налажылі повен воз, а воз стаяў у гумне, а бацька на рабоце ў Нясьвіжы... Дык яны то рады былі-б, каб я зу-

сім ня ехаў, а я ўплёўся; каня шкадаваў, дык яны мне от...

Ён прыгнуўся, і я ўбачыў на яго шыі чырвоны рубец ад нагайкі.

— Адзін калі сьвісьне... От, каня шкода— і мучыцца, і дома няма другога...

— Колькі табе год?

— Каля пакроў трынаццаць будзе...

Нудна махалі крыльлем над кустам вароны, нудна крычалі. Толькі ня было голай нуды ў чуцьцё жывога каня. Тут была вялікая вастрата— пакутная мяжа жыцьця і сьмерці. І раптам гэтая вастрата перадалася яму, ён усхваціўся на ногі, пацерабіў зрэбную сарочку і сказаў:

— За Бабруйскам конь пачаў прыставаць, а яны гоняць—адно скінеш, другое кладуць. Іх там націскалі... Дык уначы, пакінуўшы драбіны, верхам на яго (ён паказаў вачыма на каня) ды ўцёк. А ў яго ад сібернай дарогі над правым капытам нарыў пачаў рабіцца, дык ён з самага Бабруйску кульгаў-кульгаў, а тут зваліўся сягоньня ўначы, есьці ня ўзяў, а паіць яго—я паіў учора вечарам, як цераз рэчку пералазілі...

Ён зноў сеў і заплакаў.

Я прысеў каля іх абодвых на пяску і так былі тут яшчэ з гадзіну.

Конь пачаў кідацца ў бакі, качацца па зямлі і стукаць нагамі. Шыя яго больш памакрэла.

Ён дакрануўся да гэтае мокрае шыі рукою і сказаў:

— Халодны пот.

Тады конь пачаў канчацца. Канчаўся ён доўга—цёрся галавою аб зямлю, зямля налазіла яму ў рот, залеплівала жоўтыя зубы.

— Нутро ў яго здаровае, дык яму трудна канчацца.

Я памаўчаў.

— Ужо!!

Ён яшчэ трохі пастаяў над няжывым канём. Цяпер гэта была толькі куча худога мяса і доўгіх касьцей—жывая істота загінула і ўжо было лягчэй глядзець на гэта.

Мы з ім падаліся ў лес, праляжалі там да вечара, а як закрычалі ў куп'ях начныя птушкі, пайшлі мы ў бок вёсак шукаць на полі бульбы. За ўзгоркамі былі пажары—трапяталіся ў чырвоным бляску вярхі ўзгоркаў, і зорнае неба пакрывалася густым дымным праменем. У тым баку раптам загаварылі кулямёты і тут сьціхлі

птушкі. Пэўна, што недзе тут быў фронт і ва-
кол шнырaлі палякі... Куляметы загаварылі з
другога боку. Есьці нам больш не хацелася.
Ноч была трывожная.

Пад дзень тухлі пажары. І раніцою прышлі
першыя атрады нашых.

Я з ім у той дзень разьвітаўся.

Ён пайшоў усьлед з фронтам, думаючы пра
свайго замучанага каня, пра нязжатае ўпору
і, мусіць, зьнішчанае дома жыта. І адчуваў
боль на шыі, дзе быў чырвоны рубец.

Я чую яго апошнія словы, і я ўвесь у агні
і бурах.

Ліпень 1926 г.

# НАЧЛЕГ У ВЁСЦЫ СІНЕГАХ

Вялікі паход скупы на адпачынак. І мы спалі мала,—прыхваткамі, па гадзіны дзьве ў пору.

У вёсцы Сінегах засталі мы сьляды праходу ранейшых вайсковых часьцей: дзеці гулялі з кабелем; каля хлява крайняй хаты, на панадворку, на расьцярушанай саломе, параскіданы патроны; мы папрабавалі іх да сваіх вінтовак— не падышлі, так і зноў пакінулі тут.

Восем хат вёскі Сінегаў шасталі на ветры раскудлачанымі грэблямі саламяных стрэх.

Спаць лажыцца трэба было адразу.

У хаце я застаў ціхую ўстрывожанасьць і непакой напалоханых вайной людзей: чацьвёра дзяцей і жанчына—гаспадыня і маці—прыгожая гарадзенская сялянка.

Мы сьцелемся ў халодных сенцах на нейкіх нізкіх скрынях—я і наш зводны таварыш Ска-

бакоў, вясёлы і рыжы хлапец, родам з нейкіх Аланецкіх вазёрных рыбных узьбярэжжаў... Мы папраўляем салому, пацёртую ранейшымі вайсковымі начлежнікамі, кладзем пад галовы усю сваю салдацкую маемасьць, і цяжкая дрымота зразу кладзецца на вочы нашы.

Дзьверы ў гарачую хату адчынены. Там доўга і ціха спрачаюцца дзеці за нейкую „падушку з чырвонаю прошваю“ і нарэшце ўсё робіцца ціха.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Прывыкшы да трывожных раніц, я ўскідаю раптам угору галаву і стараюся разагнаць каменную ранішнюю дрымоту, Малады дзень ледзьве прапускае праз маленькае сонечнае акенца першае сьвятло сваё.

„Яшчэ пяць хвілін я паляжу, і тады буду будзіць Скабакова“,— я думаю і змагаюся з цяжкай дрымотай. Я падкладваю рукі пад галаву і сьціскаю каля вушэй. Тахкае і баліць у галаве.

У хаце я чую гаворку.

— Уставай, сынок,—гаворыць жанчына.

Усё маўчыць.

— Сынок, устань.

— Ай, мама...

— Устань, сынок, ну, хто-ж устане ты-ж
[с]амы большанькі.

— Я яшчэ хоць трохі пасплю...

— Засьнеш удзень, а цяпер—ну каго-ж я
[з]абуджу.

Хлапчанё заплакала. Ён доўга зацягнуў сан-
[л]івым голасам, цягнуў і, мусіць, спаў. Пасьля
[р]аптам сьціх. Жанчына маўчала.

Я ўстаў і пабудзіў Скабакова.

Я ўвайшоў у хату.

Жанчына рвала на кавалкі старую зношаную
[д]а адных дзірак сарочку.

— Добры дзень—сказаў я.

— Добры дзень,—адказала жанчына.

— Дзякуем за начлег, мы ўжо ідзем.

— Ідзеце.

Што мне сказаць яшчэ? І я гавару:

— Няхай хлапчук пасьпіць яшчэ трохі, няхай
[г]адуецца.

Я адчуваю сябе так, як-бы у чым вінаваты
[т]ут.

— Ну, а што я зраблю,—гаворыць яна
[р]аптам, хутка, моцна,—што я зраблю што я
[а]дна параджу. Гаспадара няма, гаспадар ваюе.
А сёньня мне трэба хоць трохі пачаць авёс жаць

дастаць дзе каня, дык хоць возік жыта прывезьці—абаб'ю як-небудзь, хоць пранікам, а вечарам у жорнах зьмялю, калі падсохне за дзень на печы, дык назаўтра хлеб рашчыню...

— А каня няма?

— Каня палякі пазаўчора ў абоз пагналі, разам з хлопцам.

— З якім хлопцам?

— З сынам.

— Вялікі?

— Малы... каб вялікі—я ня тужыла-б гэтак... А тут малога ніяк ня ўзбудзіць карову выгнаць папасьвіць. І няма чаго даць яму пасьнедаць. Накапала ўчора зранку картопель трохі, малыя ишчэ, дык пад вечар салдат накарміла—ідуць босыя, галодныя, абарваныя, абшарпаныя. Можа думаю, і мой там дзе-небудзь небарак...

Яна падышла да ложка.

— Устань, сынок, я табе новыя анучы ад свае старае сарочкі адарвала, каб табе было чым нагу мяккім абкруціць. Абуеш Мікалкавы лапцікі, яны табе вялікаваценькія і вольнаназе будзе... Устань, сынок.

Яна нагнулася над ложкам.

— Зараз праравваць павінна.

— Што?

— Нарыў. На тым тыдні яшчэ нагу прабіў на корч, дык нарывае.

І я нагнуўся над ложкам. Хлапчанё спала. На левай назе, каля пальцаў, збоку была белаватая пухліна, запэцканая ў гразь.

Я пайшоў у сенцы. У сваіх мяшкох я нічога не знайшоў, апроч двух тараноў. Я дастаў іх і палажыў у хаце на лаве—уся мая салдацкая ежа.

І тады мы з таварышом Скабаковым назаўсёды пакінулі гэтую хату.

Праз хвілін пятнаццаць мы пакінулі гэтую вёску Сінегі.

Чакаючы загад рушыць, я ўбачыў яго: накульгваючы, ступаючы на пяту, ён гнаў карову. Каля хаты стаяла маці яго—вялікая горадзенская жанчына.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

І от мы ідзем.

Будзем ісьці доўга—вялікі паход скупы на адпачынак.

Ліпень 1927 г.

---

# СРЭБРА ЖЫЦЬЦЯ

1

Рыжая барада трасецца, ўбакі ходзіць ад дробнага сьмеху.

— Гы, гы... Вучыць. Дзьмухні, кажа, на агонь—пячы ня будзе. От зараз як дзьмухну гэткую раду галавешкаю ў рыла, дык навучыш... Гы, гы...

І зморшчаны рогатам і гарачынёй адсоўваецца ад агню чырвоны шырокі твар.

— Гэта-ж не агонь, а твая, дзядзька, уласная барада цябе гэтак смаліць.

— Гы, гы...

Злавацъ спрабуе рыжы дзядзька, але нічога ў яго не выходзіць. І зноў ён рагоча. І ўсе з ім. Дрыжыць ад сьмеху яснае пры агні кола на зямлі.

— Гы, гы, гы...

Трашчаць у агні смоленыя сукі. То рась-сьцелецца агонь, нізка прыпадзе да зямлі, то шыбане раскудлачанай галавою ўгару. Выхоп-

лівае з чорнага змроку дзядзькаў твар, побач тварам—нечыя боты ў зямлі.

Збоку — пераблытаныя ногі, рукі, галовы, узьнятыя калені, шырокія сьпіны.

Яшчэ горш моршчыцца дзядзька, пхае чорным сукам у боты:

— Ты, э-э, ты. Боты адцягні, а то ў нос дае. Распусьціў свой дзёгаць, ці варволь пад самым носам хоць сякеру вешай. Чым ты іх квэцаеш, халера, цябе ведае, гэтыя свае шкрэбалы!

Ля агню падымаецца галава. Пара воч колець рыжага дзядзьку. Зноў чуваць стрыманы сьмех. Узьнімаюцца ўгару калені і боты паволі адпоўзаюць назад.

— Мікіта дзядзьку з ботаў у нос дух пусьціў.

— Сьвяты дух Мікіта пусьціў.

— Х-ха...

— Г-гы...

Між кустоў, змрочных, баязьлівых ходзіць рогат з дымам. Трасецца агонь, дрыжыць ноч.

Трэснула у суставах.

— Не пацягайся гэтак, на кавалкі парвешся.

Голас у дзядзькі шурпаты:

— Глянь, ты адно, Мікіта, на зоры ці не за поўнач гэта пераваліла ўжо?

— Пераваліла.

— Дык спаць.

Вострым махорачным водырам патыхае ад агню. Клінок даўно няголенай барады уткнуўся ў зямлю, цыгарка—у жар.

Рыжы дзядзька пачынае драмаць.

Абодвы яны з Мікітам як-бы старшыя тут, паміж гэтымі цесьлярамі. Гэтак неяк само сталася. Яшчэ ўчора зрабілі яны апошнюю работу—на глухой станцыі скончылі новы будынак на склад і цяпер асталіся на дзень яшчэ выгрузіць з вагонаў пясок.

Як пачыналі яны работу, раптам пазнаваць пачалі леташняга знаёмага:

— Хіба вы, таварыш, нас не памятаеце?—гаварыў Мікіта загадчыку работ на станцыі.—Мы-ж тут летась два месяцы былі, шпалы часалі.

— А хто вас ведае,—адказваў той,—у мяне за год вашага брата сотні пераверпецца. Што, я павінен памятаць кожнага, ці што?

— Мы яшчэ пасьля з Мікітам тыя шпалы й паразвозілі па лініі,—устаўляў сваё слова рыжы дзядзька.

З якім гэта яшчэ там Мікітам?

— Ну а са мною, — гаварыў Мікіта, пакаваючы пальцам сабе на грудзі.

Заўтра яны зробяць апошнюю работу і на якім-небудзь таварным цягніку праедуць некалькі станцый дадому.

2

Абшар зямлі — як мора, змрок і сьвятло — як хвалі.

Дзень ідзе паўзе з яснага поля.

За кілёмэтраў пяць — горад адазваўся новаму дню. Зазваніла, загуло, абарвалося.

Дрэмлюць кусты, тлее вугольле. Агонь пацягваецца ў перадсьмяротнай млосьці — патухне — блісьне. Блісьне — патухне. У кустох сьмяецца вада ранішнім сьмехам:

— Люг-бр, люг-бр...

Людзі ля вогнішча гоняць ад сябе апошнюю дрымоту.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

І вось ужо няма нічога: ператварылася зямля ў шырокую роўнядзь і ўцякае; ператварылася неба ў імглу залатога сьвятла і сыплецца — зьнікае, сыплецца — зьнікае. Ёсьць і шырыцца рух цела, лёгкая гарачыня ў ім і ў вачох залатыя дарогі пяску з вагонаў.

На пярэднім вагоне дзядзькава барада блішчыць здалёк, усё-адно як той жвір, што ў яго пад нагамі. За дзядзькам шпарка ходзіць мікітавы плечы. На поўных вагонах—галовы й рукі, галовы й рукі. Блішчаць як срэбра рыдлёўкі. Голас скамандаваў.

— Дошку ўгару хапі!

Дзядзька рад. Адарваўшыся ад пяску, ён азірае раніцу й людзей. Раніца—шырокая, гулкая, людзі—рухавыя.

Зноў ідзе голас:

— Бярэш, там?

— Бяру,—коціцца недзе з задніх вагонаў.

Вагоны пусьцеюць. Сыходзяць людзі на зямлю. Задні вагон грануў іржавую песьню з-пад калёс: пхнулі яго па рэйках.

Раптам—звон, грукат і ляскатаньне. Загрымела жалеза за мостом, ухнула й пакацілася па бакавой каляіне. Голас ня мог дагнаць:

— Скоры пайшоў!

І толькі неўзабаве задні вагон цягніка зелена мільгануўся.

— Ці гэта дым, ці хмары?—раптам гаворыць дзядзька, паглядаючы туды, дзе тырчаць гарадзкія коміны заводаў.

Сонечны вецер сушыць на людзях пот.

Вагоны ўсе пустыя. Хтосьці насьпеўвае ціха:

Пад гарой й на гары.
Таўкуць кашу камары.

Вецер імчыць песьню па лагчынах і ўзгорках і разьвявае ў прасторы.

Пачало было хмарыцца, а пасьля вецер перамог: хмары сышлі і сонца зноў задрыжэла на зямлі.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Сьвісток пабудзіў сонных.

Лезьлі ў вагон, сонна пацягваючыся яшчэ.

Дзень гас.

Стары, растрыбушаны вагон не пасьпяваў бегчы за паравікам і ўсё станала з-пад іржавых калёс:

— Па-ча-кай, па-ча-кай.

Аб'ехалі горад стараною. На лічаныя хвіліны сталі адно на таварнай, дзе дадаваліся да таварнага цягніка вагоны. І зноў пайшлі. Станцый пяць—і дома!

Горад паплыў як у тумане. Вечар кладзецца на загарадныя, прывагзальныя вуліцы. Штосьці пракалыхнулася, вецер трэпле чырвоную тка-

ніну. Як гарох сыплюцца дзеці, рассыпаючы песьню.

Жура-жура-журавель,..

Малы астаўся ззаду, выбіўся з радоў і цягне ўсё без канца, парстка й няроўна:

Зюра-зюра-зюра-зюра...

Раптам схавала ў сабе гэтую „зюру“ вайсковая капэльля.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Жалезны звон гораду ўздымаецца вышэй заводзкага дыму і падае на прастору вячорнай зямлі.

1925 г.

## ВЫЗВАЛЕНЬНЕ

СЦЭНЫ

### 1. НА РУІНАХ

Адвечным шумам сваім стары лес не парушае жудаснае цішыні. Усё маўчаць і чакае, як перад пачаткам страшнае навальніцы. Ля самага лесу разбураная палякамі вёска—попелішчы хат, руіны. Дзьве-тры апошнія хаты ў самым лесе, ледзьве засталіся стаяць. На пярэднім пляне—студня, вуліца тут шырокая, як-бы пусты пляц. Ля студні двое дзяцей—Міхалка і Настачка, гуляюць у пяску з выстралянымі гарматнымі набоямі і вінтовачнымі патронамі. Больш нідзе нікога, і ад гэтае пустаты і ад спакойнага ляснога шуму—яшчэ большая жудасьць лажыцца на страшныя руіны.

Дзеці гавораць.

Міхалка. От мне было страшна, як мы хаваліся з мамаю ў склепе.

Настачка. Ты думаеш адно табе было страшна! І мне таксама! І маме.

Міхалка. Не, мама не баіцца.

Настачка. Чаму.

Міхалка. Бо мама вялікая.

Настачка. А ты думаеш вялікія не баяцца?

Міхалка. Не. Мама не баіцца. Тата таксама. Каб баяўся, дык не пайшоў-бы ў лес з стрэльбаю.

Настачка. А мама-ж казала што гэта ён да дзядзькі на работу пайшоў.

Міхалка. Не, я-ж ведаю.

Настачка. А чаго-ж мама плакала ўночы, калі яна не баіцца?

Міхалка. А хіба яна плакала?

Настачка. Няўжо ж не! Я сьцішылася і ўсю ноч слухала, а яна думала, што я сплю і нічога ня чую... Я хі і-трая!

Міхалка. Я таксама хітры.

Настачка. Чаму?

Міхалка. Бо я падгледзеў, як той дзядзька, што зранку прыходзіў, схаваўся ў нас на гары. Я сьцішыўся ў сенцах пад жорнамі і ўсё бачыў.

Настачка. Я ведаю, чаго мама плакала.

Міхалка. Ну чаго?

Настачка. Мама думае, што тату забілі *(Плача)*.

Міхалка. Дурная ты. Тата вялікі і сьмелы. Сьмелых не забіваюць. *(З лесу выходзіць абарваны чалавек—Максім Пыліла. Крадзецца, агглядаецца).*

Міхалка. Нехта йдзе!

Настачка. Міхалка, уцякайма ў хату, мне страшна. *(Нарыхтаваліся бегчы. Раптам пазнаюць).*

Міхалка. Гэта-ж тата!

Настачка. Тата!

Бягуць насустрач. Абнімаюць бацьку за ногі і гэтак ідуць з ім. Чалавек гладзіць іх галовы і падыходзіць з імі да студні.

Міхалка. Чаму ты кульгаеш?

Настачка. Табе баліць?

Міхалка. Нага?

Настачка *(праз сьлёзы).* Кроў у цябе, тата-а-а.

Міхалка. Наназе.

Максім Пыліла. Чортавая маўчанка. Каб хоць крыкнуў хто. Як анямела ўсё!

Міхалка. Ты больш ня пойдзеш?

Настачка. Будзь дома.

Максім Пыліла. Палякоў ня было тут цэлы дзень?

Міхалка і Настачка. Не.

Міхалка. Адно дзядзька нейкі схаваўся на гару.

Максім Пыліла (*павесялеў*). Схаваўся? Зранку ці нядаўна?

Міхалка. Зранку. Мама выправіла нас на двор, як ён хаваўся, я падлез пад жорны і падгледзеў. Мама пасьля й гаворыць мне, што дзед вады напіўся й пайшоў, а я адно маўчу!

Максім Пыліла ўсьміхаецца, абнімае дзяцей і йдзе да самае апошняе хаты пад хвоямі. Зьнікаюць за хатаю. Пуста і ціха. За сцэнай тупат конскіх ног. Чуваць як загаварылі раптам польскія салдаты. На сцэну выходзяць два польскія афіцэры—Дварацкі і Глянцэвіч і некалькі салдат з імі. Аглядаюць руіны і гавораць ціхавата.

Глянцэвіч. Вас хіліць дрымота?

Дварацкі. Не, я хачу піць.

Глянцэвіч. Як у сьне, я ехаў сёньня цэлы дзень.

Дварацкі. Вы ня спалі ўночы?

Глянцэвіч. Спаў. Але я еду па роднай зямлі, па сваёй зямлі, якую пакідаем бальшавіцкім кацапам.

Дварацкі (*абыякава*). Ах, праўда, вы тутэйшы.

Глянцэвіч. Я разумею пана Пшэвідніцкага, калі ён агонь і меч раіць класьці там, адкуль адыходзім.

Дварацкі. А я не разумею.

Глянцэвіч. Пшэвідніцкі? Тры дачкі яго замужам за тутэйшымі магнатамі. А Плашчавічы, самы буйны яго маёнтак, учора спалілі хлопы. А сына яго таксама забілі тут, на гэтай зямлі.

Дварацкі. Штаб! Дык гэта Плашчавічы Пшэвідніцкага маёнтак?

Глянцэвіч. Таму й спалілі, што там быў штаб. Хлопы паўстанцы.

Дварацкі. Вы бачылі пасьля гэтага Пшэвідніцкага?

Глянцэвіч. Так. Ён заўсёды нязьменны. Цяпер вайна і ён, як камень. Гэта жалезны чалавек і арыстократ. Верны сын Жэчы Поспалітай, краёвы патрыёт.

Дварацкі. Я яго толькі раз бачыў.

Глянцэвіч. Ён ужо выяжджае. Ён зараз тут праяжджаць будзе... Ведаеце плян? Сам генэрал распрацаваў. Мы адыходзім. Чыгунку скроазь пакідаем ім цэлую. Гэта пастка. Хтонебудзь застанецца ў іх у тылу ўзарваць мост, як толькі цягнік іх з штабам, камандаваньнем,

ці як там будзе, даедзе да мосту. Штаб іх арміі ў гэтым цягніку, адсюль цяпер кілёмэтраў пяцьдзесят.

Дварацкі. Загаду яшчэ ня дадзена?

Глянцэвіч. Сакрэтны загад зараз будзе. Я Пшэвідніцкага бачыў у тую хвіліну як прышлі весткі пра штаб і Плашчавічы, ён толькі сьціснуў зубы. За лесам мой маёнтак. А народ гэты былыя падданыя майго айца. Хлопаў тутэйшых ўсіх ў твар ведаю. Там, у той халупцы, Пыліла Максім жыве. Стары Пыліла быў наш пастух, а я, малы, меў фантазацыю на ім верхам езьдзіць. Бывала заўсёды яго клікалі, я саджуся на яго, а ён ракам возіць мяне на сабе па дзядзінцы.

За сцэнай тупат конскіх ног. На сцэну выходзіць Пшэвідніцкі з лёкаем. Ён падае Глянцэвічу руку. Ціха гаворачы, адыходзіць у глыбіню сцэны. Салдаты, што застаюцца ля студні, адразу весялеюць, трымаюцца вольна, дастаюць і п'юць з студні ваду.

## 2. НА ДЗІЦЯЧЫХ ВАЧОХ

У хаце Пыліллава жонка закалыхвае дзіця. Цішыня, і чуваць як тут-жа за вокнамі шуміць лес. Жанчына ціха сьпявае дзіцяці і гаворыць сама з сабой.

Марыля. Божа мой, што я параджу адна. Аж дрыжу ўся сярод гэтае пусткі. Уночы ўсё

неба ў агні, нават у неба глянуць нельга спакойна. Ніводнае нідзе мясьцінкі няма... Сьпі, маленькае, сьпі... (*Сьпявае малому. На дварэ дзіцячыя галасы, шум. Марыля глядзіць здалёк у вакно*). Максім!.. Настачка! Міхалка!

У хату ўваходзяць—Настачка, Міхалка і Максім Пыліла. Марыля кідаецца да Максіма, сьмяецца, плача!

Максім. Хоць прысесьці на хвіліну.

Марыля. У гэтакім жаху пабыла я ўсе гэтыя дні!

Максім. Пасьля таго гвалту ня былі больш?

Марыля. Тут не. Адно палілі залесныя хутаркі... Усе нашы суседзі ў лесе сядзяць—хто куды паразьбягаліся, няма тут ужо дзе дзецца.

Міхалка (*паказвае на столь*). От там ён схаваўся.

Марыля й Максім пераглядаюцца. У Марылі дрыжаць губы. Максім усьміхаецца.

Максім. Ты дагледзіш усюды! Уладзімер!

Марыля. Я старалася, каб яны ня бачылі.

Глядзіць на дзяцей, уся ўздрыгваецца. Відаць, што змучана яна за гэтыя дні, стрывожылася. У хату ўваходзіць Уладзімер—малады хлапец,

аброс увесь барадою, адзежа на ім вываляна ў зямлі, твар абветраны. Максім садзіцца і кладзе ля сабе рэвольвер.

Уладзімер. Дзяндобры.

Максім. Ну?

Уладзімер. Ты расказвай.

Максім. Плашчавічы спалілі і штабную канцыляру ня ўсьпелі яны выратаваць.

Уладзімер. Гэта чуў.

Максім. А ты што?

Уладзімер. Я цэлы дзень прасядзеў тут. А ўсю ноч ішоў. Зараз пачнуць адступаць і з гэтага месца. Цяпер трэба вартаваць вёскі, каб не палілі й каб дабра не забіралі.

Марыля. Я ня вытрываю тут адна й некалькі дзён... Абы ноч—усё неба ў агні, палае ўсё навакол... І адзінота гэтая... Што нам рабіць...

Максім. Ня многа асталося перацярпець. Можа-б дзеці вышлі з хаты на момант... Настачка, Міхалка, ідзеце на двор пагуляйце крыху, зараз я вас пакліччу...

Дзеці паслухмяна ідуць з хаты. У дзьвярох Міхалка спыняецца на момант, усьміхаецца бацьку ў вочы. Максім гладзіць яго па галаве і зачыняе за ім дзьверы.

**Максім.** Цяпер усе мы зьбіраемся ў лесе, за чыгуначным мастом. Я адно перавяжу нагу і рушым. *(Да Марылі).* Пацярпі, перабудзь дзён колькі, тады навала адыдзе... Глядзі дзяцей.

За сцэнай гавораць палякі. Максім і Ўладзімер кідаюцца хавацца, але ўжо ў сенцах хтосьці. Максім адчыняе вакно і выглядае, але й там кагосьці бачыць. Кідаецца назад і ў росчуваць. пачы зноў да вакна, скача ў яго. Уладзімер сьледам за ім строіцца. Дзесьці-ж за сцэнай хтосьці закрычаў і Ўладзімер застаецца ў хаце. Спакойна азіраецца, аддзірае ў кутку з падлогі дошку, лезе туды. Марыля накрывае дошку зноў. Дошка тырчыць і яна кідае на яе ўсялякія лахманы. Цішыня. Настачка й Міхалка ўбягаюць у хату, кідаюцца да маці. Маці дрыжыць і плача, нагнулася над калыскаю.

**Марыля.** Божачка мой, калі гэта спакой будзе. Максім. Пасіраціць ты захацеў дзеці свае. У людзей хаты папалены, але хоць самі могуць спакойна вярнуцца, хоць на попелішча свае. А гэта—туляцца трэба... А жытцо тое—ні жаць яго, ні пакідаць намарна. Асыпаецца яно, перасьпела, божа мой!.. Як неспа-

койна!.. Каб хоць спакой хутчэй, каб пажыць на сьвеце ціха...

Калыша дзіця. У хату уваходзіць: Пшэвідніцкі, афіцэры—Глянцэвіч і Дварацкі і некалькі салдат. Марыля дрыжыць уся ад жудасьці, туліцца да калыскі. Пшэвідніцкі зморана садзіцца ля стала і махам рукі запрашае сесьці афіцароў. Міхалка і Настачка туляцца да маці.

Пшэвідніцкі. Еду!.. Я думаю, панове—мы вернемся.

Глянцэвіч. Выправадзіць бабу!

Дварацкі. Уцячэ.

Глянцэвіч. Дзіця пакінуць тут! Не ўцячэ!

Салдаты выпіхаюць Марылю з хаты, яна ля парогу авіраецца на калыску, яе бяруць пад рукі і выкідаюць. Настачка й Міхалка аж зайшліся з плачу. Неўзабаве кідаюцца ў сенцы, сьледам за маці.

Глянцэвіч. Узарваць мост даручана будзе мне. Заставацца мне трэба будзе ў іхнім тылу. Штаб іхняй арміі павінен паплысьці пад мастом разам з усім цягнікам.

Пшэвідніцкі. Ну, я выяжджаю. Мы ўбачымся тут-жа, у сваіх маёнтках у лепшыя часы і неўзабаве.

Цалуецца з Глянцэвічам і разьвітваецца з Дварацкім. Выходзіць. Салдаты ўводзяць у хату Максіма Пылілу. Марыля ўбягае за ім з плачам. Настачка й Міхалка дрыжаць ад страху.

Глянцэвіч. Ну?

Максім. Нічога, пане.

Дварацкі. Чаго ўцякаў.

Максім. Напалохаліся ўсе мы, пане. Час неспакойны. Вайна.

Глянцэвіч. Ну! Плашчавічы паліў?!

У Максіма задрыжалі губы і твар пабялеў. Але
ён зараз-жа ўзяў сябе ў рукі.

Максім. Чуў, паночку, што Плашчавічы згарэлі.

Дварацкі. Чуў? Ты чуў!

Глянцэвіч. Ты сам паліў!

Дварацкі. Ён мне самому пра ўсё раскажа. А ня скажа—сам застрэлю, як пса.

Глянцэвіч. Трымаць яго.

Максіма зьбіраюцца выводзіць. Глянцэвіч ня спускае з яго вачэй. Максім Пыліла таксама глядзіць на Глянцэвіча. Глянцэвіч раптам б'е яго па твары. Настачка й Міхалка закрычалі. Марыля падае на калені перад Глянцэвічам, той адыходзіць. Дык яна паўзе сьледам за ім.

Марыля. Паночку, вы ж наш пан! Паночку вы нас ведаеце. Вы нас...

Глянцэвіч. Прэч!

Максіма выводзяць. Марыля на каленях паўзе за
Глянцэвічам.

Глянцэвіч. На допыт і... застрэліць. Паход!

Спыняецца, абварочваецца назад і ботам адкідае ад сябе Марылю. Яна ўсхватваецца, становіцца перад ім і кідае яму ў вочы, трымаючыся рукою за пабіты ботам твар: „Гад! Панская поскудзь! Кат!" Дрыжыць, кідаецца да калыскі, туліцца да яе, гаворыць: „Сьпі, сыночак, расьці, каб моцны вырас, тады мо абароніш маці ад паноў!" Глянцэвіч асадкаю рэвальвэра б'е яе ў плечы. Настачка й Міхалка кідаюцца ў куток. Глянцэвіч даў нагою ў калыску, калыска пахілілася на бок і дзіцянё ўпала. Чуваць страшны, цьвёрды стук і дзіцянё нават не адазвалася. Глянцэвіч з выглядам ганарыстага пакутніка выходзіць з хаты. Марыля рве на сабе валасы, разрывае каўнер сарочкі. Як анямелая стаіць над няжывым дзіцём. На твары яе люструецца вар'яцтва. Яна спакойна бярэ з зямлі дзіцянё, кладзе назад у калыску і калыша. Пачынае сьпяваць калыханку. За вокнамі ціха шуміць лес, жудасная цішыня спавівае ўсе і ў ёй, як страшны дысоланс, гучыць калыханка. І тут Марыля пачынае разумець усё. Азіраецца па хаце. Апомнілася, зразумела ўсё. Бачыць на лаве Максімаў рэвальвэр; бярэ яго й кліча Настачку і Міхалку. Паволі йдзе да дзьвярэй, з пакутаю на твары й вядзе з сабою дзяцей. З-пад дошкі вылазіць Уладзімер, цьвёрдасьць на яго твары. Раптам за сцэны галасы польскіх салдат, выдзяляецца Глянцэвічаў голас, дым засьцілае вокны, шыбануў у вакно агонь. Хата гарыць.

## 3. БЕЗ ДАЛІКАЦТВА Й ПАКОРЫ

Заняты палякамі горад. На цэнтральны пляц сыходзяцца некалькі вуліц, ад пляцу яны йдуць у глыбіню гораду, уніз. У глыбіні сцэны—адно насупроць другога—паабапал вуліцы, што проста йдзе,—касьцёл і царква. Нядзеля, за поўдзень, у бажніцах адбываецца набажэнства; звоняць у царкве й касьцёле. Па пляцу, з вуліц у вуліцы, праходзяць усялякія людзі. Ля касьцёлу лёкаі чакаюць паноў, дробная засьцянковая і гарадзкая шляхта, там-жа стаіць польская вайсковая варта: у касьцёле на імшы шмат магнатаў і вайсковых чыноў. Ля царквы таксама народ, гарадзкое мяшчанства, ёсьць і вясковыя сяляне, часта-густа можна бачыць былога царскага чыноўніка, але ён ужо дапасаваўся да новае ўлады і дзяржавы—у яго ўжо часамі „белы ожэл“ на шапцы. Насупраць сярэдняе вуліцы, пасярэдзіне між царквой і касьцёлам—старцы, некалькі лер, некалькі жаночых галасоў і мужчынскіх. Яны сядзяць на зямлі, перад імі разасланая дзяружка, на якую людзі кідаюць хто што мае з сабою. Непадалёку ад старцоў Марыля, яна на пярэднім пляне, а ля яе Настачка й Міхалка. Спявае старэчы хор:

Матка боска глянула
На галодных сіратак,
Былі яны голыя,
Босыя, галодныя.
Матка боска сумелася;

Уся засмуцілася;
Небаракам сіраткам
Колькі трэба хлеба
З неба спусьціла.

Настачка й Міхалка з цікаўнасьцю азіраюць людзей, места, прыглядаюцца, прыслухоўваюцца да ўсяго. Марыля сядзіць апусьціўшы вочы. У царкве звоняць. Пасьля набажэнства з царквы йдзе епіскап. З царкоўнага ганку ён блаславуляе старцоў й ідзе далей. Марыля раптам падымаецца, хапае за рукі Настачку й Міхалку й кідаецца да епіскопа. Ён думае, што яна гэта падводзіць дзяцей пад блаславеньне і ўзьнімае руку.

Марыля. Айцец сьвяты наш, зьлітуйся, паратуй нас, ты можаш...

Епіскап. У чым твая просьба, дзіця мае?

Марыля. Пусьцілі мяне з малымі дзецьмі з торбаю па сьвеце, хатку спалілі, дзіцянё мае маленькае забілі аб зямлю галоўкаю, а яго чалавека майго, пагналі страляць. Ён тут, нашы людзі мне казалі, яго сёньня цэлы дзень водзяць з допыту на допыт. Папрасі, айцец наш, ты маеш сілу, каб яго пусьцілі! (*кідаецца яму ў ногі*).

Епіскоп. Калі ён невінаваты, яго пусьцяць. (*Ідзе далей*).

З касьцёлу выходзіць народ. Лёкаі ўслугоўваюць паном і вайсковая варта выстройваецца. Выхо-

дзяць польскія афіцэры, з імі пані. паненкі і паны. Дварацкі і Глянцэвіч пад руку з дачкою Пшэвідніцкага. Сам Пшэвідніцкі йдзе крыху ззаду. Пшэвідніцкага дачка ў белым убраньні, на ёй зіхаціць золата. І ўся кампаньня навокал яе зіхаціць убраньнем. Старцы строяцца, падаюцца бліжэй да касьцёлу, поліцыянты адганяюць іх, таксама адціскаюць назад увесь просты народ. Марыля ўглядаецца ў народ ля касьцёлу, пазнае Глянцэвіча.

Марыля. А божа! (*Да Настачкі і Міхалкі*). ...ь той!..

Роспач на яе твары. Настачцы і Міхалку страшна. Міхалка азіраецца ў вуліцу, што за царквою. Адтуль вядуць арыштаваных сялян.

Міхалка. Тату вядуць!

Марыля прыглядаецца, паднімаецца насустрач, Настачка і Міхалка не астаюцца ад яе. Арыштаваных падводзяць бліжэй. З імі спатыкаюцца тыя, што вышлі з касьцёлу. Некаторыя паны спыняюцца і з цікавасьцю разглядаюць арыштаваных. Глянцэвіч пазнае Максіма Пыліпу, і загадвае яго тут спыніць на момант. Усіх вядуць далей.

Пшэвідніцкага дачка. Хто гэта?

Глянцэвіч. Пляшчавічы паліў.

Пшэвідніцкага дачка. Там згарэў ...атуй мадонны! Папа з Рыму прывёз! Не ўспа...наўце мне пра гэта.

Глянцэвіч. Не ўспамінаць, значыцца, забыцца. А забывацца мы ня можам.

Пшэвідніцкага дачка. Татусь!

Пшэвідніцкі выходзіць наперад і ўзіраецца ў Пілілу. Чуваць галасы з натоўпу.

Першы голас. Углядаецца.

Другі голас. Мужыка ніколі ня бачыў, ці што?

Трэці голас. (*ціха*) Каб яму вочы павылазілі.

Чацьверты голас. Каму гэта вочы?.. Ах, ты бальшавік!..

Глянцэвіч. Гэты паліў Пляшчавічы.

Пшэвідніцкі. Паганы!..

Глянцэвіч. А ў маім дварэ, як пачалася рэволюцыя, гэта-ж ты коні конфіскаваў! Цяпер я ведаю!

Глянцэвіч падаецца да Максіма. Максім сьціснуў кулакі.

Настачка. Тату забіваць будзе!

Міхалка. Тата!

Марыля. Максім!..

Максім. Марыля, ты!? Чаму ты ня дома?

Марыля. Няма больш у нас дому. Няма ў нас сыночка нашага. Дзе праўда?.. Максім, чуеш ты! Аб зямлю нашага маленькага, забілі, забілі яго!

Максім. Хто забіў?

Марыля. О гэты!

Пшэвідніцкі падбягае раптам.

Пшэвідніцкага дачка. Татусь!

Максім падаецца наперэд.

Глянцэвіч. Зьвязаць!

Максім. За што вязаць мяне!

Пшэвідніцкага дачка. Дарагі статуй мадонны, работу вялікага мастака, ты спаліў мне. Ты мне аплаці зруйнаваную культуру?

Максім. Аплаці мне пакуты маіх дзяцей! Чуеш? Ты!

Марыля. Дзіця забілі і хату спалілі!

Становіцца перад паненкаю, уся ў зрэб'і, абарваная, у зямлі. Яны абедзьве нейкі час ядуць адна адну вачыма. Старцы абступаюць іх. Максім раптам кідаецца ў натоўп. Гармідар і тлум. Натоўп разьбягаецца. Страляюць. Максім зьнік у бакавой вуліцы. Пляц пусьцее. Навокал становяцца паліцыянты й вайсковыя патрулі. Марыля з дзецьмі зьнікае ў вуліцы налева.

## 4. ЗА КРАІНУ САВЕТАЎ

Прыгожая, вясёлая мясцовасьць. Налева ў глыбіню йдзе лес, направа й скрозь мясцовасьць адкрытая, зяленяцца поле й паплавы. Над ракою ўзвышаецца чыгуначны мост, рака схавана ў высокіх берагох, мост высока, і над самай зямлёю відаць толькі яго надводныя ўмацаваньні; на самым краю малюнка, далёка, відаць палатно чыгункі. Сонечная раніца. Некалькі чалавек партызанаў туляцца да зямлі ў прыберажным хмызьняку. Цішыня. І ўсё тут робіць ураджаньне бязьмежнае шырыні. Пад мостам, відаць адгэтуль, ціхі, лёгкі рух аднаго чалавека ў польскай вайсковай форме. Ён туліцца да цымантовага муру і стараецца ўзьлезьці да таго месца, дзе на ўмацаваньнях ляжыць мост. Неўзабаве, пад мостам, на самым беразе, ля вады, зьяўляецца яшчэ некалькі чалавек, адзін падае першаму знакі рукою. Расьвітаньне йдзе шпарка. Вайсковец, што падае знакі, па ўсходах збоку ўзыходзіць на мост, баязьліва азіраецца і ў бінокль азірае мясцовасьць. Ён гнецца да парэнчаў, моцна здалёк шэпча чалавеку пад мостам, той падняўся ўжо вышэй і рыхтуецца закласьці міну. Яго таварышы стаяць пад ім. Чалавек на мосьце пасьмялеў, ён становіцца роўна, і цяпер відаць, што гэта Глянцэвіч. Раптам ён заўважае штосьці ў тым месцы, дзе ляжаць партызаны—рух нейкі, рухавы; як бы цень. Ён сумеўся, зноў прыгнуўся й падаў знак камусьці за мостам. Тады адтуль пачынае выходзіць польскі атрад.

Партызанскі правадыр моцна крычыць каманду, і партызаны з крыкам „ура" выбягаюць да мосту і на чыгуначнае палатно. Частка партызан ла-жыцца пад сховаю высокага берагу ў баявы лан-цуг з вінтоўкамі. З імі Марыля. Сакоча кулямёт. партызаны прыступам бяруць мост. Глянцэвіч зьбягае з мосту. але яму на ўсходах перагародж-вае дарогу Максім. Глянцэвіч падаецца назад суверх. І там яны схватваюцца з Максімам. Су-тычка заціхае, палякі адыходзяць, партызаны цісьнуць іх далей. На мосьце Максім прыгнуў Глянцэвіча да парэнчаў, кідае Глянцэвіча ўніз, у ваду. Некалькі партызан цэляцца туды, дзе ўпаў Глянцэвіч.

Неўзабаве праходзяць першыя франтавікі-чыр-вонаармейцы. Натоўпы сялян выходзяць спаты-каць іх. Настачку й Міхалку відаць у натоўпе. Пачынаюць праходзіць ўсё новыя чырвонаармей-скія часьці. Апошняя часьць ідзе с музыкай. Марш; у ім чуваць асобныя мясьціны „Інтэрна-цыяналу".

На мосьце ладзіцца мітынг.

— Няхай жыве краіна саветаў!
— Няхай жыве савецкая Беларусь! —
—крычыць натоўп.

Чэрвень, 1930 г.

---

## ЗЬМЕСТ


*Стар.*

Сям'я Юрыя Гарэйкі . . . . . . 3
Малюнак . . . . . . . . 25
Забойства . . . . . . . . 39
Буры. . . . . . . . . 58
Начлег у вёсцы Сінегах . . . . . 63
Срэбра жыцьця . . . . . . . 68
Вызваленьне . . . . . . . . 75

1964 г.

Бел. аддзел
1994 г.

+

3/3.000/9.000/45к./135

1
64 мас[illegible]
61

Ор/[illegible]

Цана 45 кап.

429

B000000272723